ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
4 ЛЮТАГА 2016 г. ЧАЦВЕР № 21 (28131) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Размеркаванне: павіннасць ці прывілея?




Плячо падставіць студэнцкі прафсаюз




Конкурс «ЧЗ»: першыя «пробы пяра»

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Стратных гаспадарак у краіне не павінна застацца да 2020 года. Мы павінны павысіць рэнтабельнасць продажаў, давёўшы яе прынамсі да 10%, і матывацыю працы ў аграпрамысловым комплексе. Толькі праз павелічэнне прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі мы абавязаны выйсці на зусім новыя параметры развіцця АПК. Падрыхтаваны праект указа аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сельгаспрадпрыемстваў. За будучую пяцігодку вытворчасць прадукцыі на сельгаспрадпрыемствах плануецца павялічыць на 24,5%, ва ўсіх катэгорыях гаспадарак — на 16,2%. Гэта дазволіць забяспечыць харчаваннем унутраны рынак і сфарміраваць запас прадукцыі для продажу на экспарт».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21718,00 | ▲ |
| Еўра | 23676,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,07 | ▼ |
| Укр. грыўня | 846,71 | ▲ |

# ЗДАРОВАЯ АДЛІГА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Для заняткаў спортам любое надвор'е... падыходзіць!.. Асабліва калі ў гарадскім двары ёсць спартыўная пляцоўка з такім, як на гэтым здымку, абсталяваннем — сучасным, надзейным і, галоўнае, карысным для фізічнага развіцця, на якім могуць займацца і дарослыя, і дзеці.**

**Юныя жыхары Кастрычніцкага раёна сталіцы з задавальненнем бавяць свой вольны час на новай пляцоўцы (яна з'явілася тыдзень таму) пасля школьных заняткаў.**

■ Адкрываючы Радзіму

## З ВЫШЫНІ ПТУШЫНАГА ПАЛЁТУ

Сярод турыстычных прапаноў — падарожжы да сакральных мясцін і лінгвістычныя туры



**По ўсім свеце знаходзяцца людзі, гатовыя плаціць тысячы долараў, каб пахадзіць па бясконцым снежным полі на Паўночным полюсе ці паўглядацца на ваду возера, у якім быццам бы жыве лахнеская пачвара. Але лепш бы яны ехалі ў Беларусь і тут правялі час куды цікавей, даведаліся багата разнастайнай інфармацыі, убачылі прыгожыя мясціны, пашчыравалі на нашых фестывалях, пакаштавалі розных прысмакаў, ды і без цудаў таксама не засталіся б. І будзем спадзявацца, што ў бліжэйшы час гасцей з замежжа ў нас паболее. Днямі былі падпісаны камюніке з прафсаюзнымі тураператарамі Расіі, Малдовы, Казахстана, Узбекістана, Грузіі. Упершыню з часоў распаду Савецкага Саюза зроблена спроба адрадзіць былую добрую традыцыю па абмене турыстычнымі прафсаюзнымі групамі, створаны клуб прафсаюзных тураператараў. Адбылося гэта ў межах прафсаюзнай экскурсійна-турыстычнай выставы «Прафтур-2016».**

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

## У «ШЭРУЮ» АРЭНДУ ЛЕПШ НЕ ГУЛЯЦЬ

### Пытанні і адказы падаткаабкладання

**Літаральна ў дзень выхаду матэрыялу пра дэклараванне даходаў («Падлічыць і разлічыцца» ва ўчарашнім нумары) у рэдакцыю пачалі паступаць даволі цікавыя пытанні ад гаспадароў кватэр. Напрыклад, калі чалавек афіцыйна здае сваё жыллё і плаціць фіксаваны падатак, то навошта яму потым добраахвотна паказваць інспекцыі ўзровень гэтага даходу і даплачваць па выніках года яшчэ дадатковыя грошы? Калі ж гэта ўсё-такі рабіць, то які дакладны алгарытм падліку? Што будзе, калі ўласнік «забыўся» гэта зрабіць, а інспекцыя заўважыла? А яшчэ нашых чытачоў цікавіць тое, ці плануецца хутка павялічваць фіксаваную стаўку гэтага падатку і ўвогуле, ці магчыма заплаціць такі падатак уперад на год яшчэ па старых расцэнках? Мы шукалі адказы разам са спецыялістамі падатковай службы.**

### ІНСПЕКЦЫЯ НЕ СПІЦЬ У ШАПКУ

Пытанні атрымаліся розныя і нават не заўсёды карэктныя. Але яны ёсць, таму і адказваем. Калі кватэраздатчык дакументальна афармляе адносіны з кватарантам у разліковым цэнтры ЖЭСа, то ў дагаворы існуе графа, дзе прапісваецца памер арэнднай платы за месяц пражывання. А далей копія гэтага дагавора трапляе ў падатковую інспекцыю, дзе спецыялісты могуць падлічыць агульную суму даходу ад здачы канкрэтнай кватэры.

Зразумела, што ў дагаворы гэтую лічбу платы за арэнду (звычайна ў валютным эквіваленце) можна і не пісаць. Аднак у гэтым выпадку пры нейкіх спрэчных пытаннях паміж бакамі кватарант можа ўвогуле адмовіцца плаціць сур'ёзныя грошы, а скасаваць з ім дагавор магчыма будзе толькі праз суд. А каму з гаспадароў гэта трэба?

Існуе яшчэ адзін варыянт, калі бакі дамовіліся палюбоўна, але кватарант патрабуе ад уласніка расліску за атрыманыя грошы. Надалей гэта распіска выкарыстоўваецца бескватэрным работнікам для атрымання падатковых ільгот па месцы працы. І зноў атрымліваецца, што інфармацыя аб вашых канкрэтных даходах ад арэнды трапляе ў базу падатковай інспекцыі. Кола замкнулася.

СТАР. 2

■ Знешняя палітыка

# АДНОСІНЫ З ПАСЕ НАЛАДЖВАЮЦЦА



**Парламенцкая асамблея Савета Еўропы хацела б бачыць Рэспубліку Беларусь у еўрапейскай сям'і, а прадстаўнікоў парламента нашай краіны — у ПАСЕ. Пра гэта — Мікалай САМАСЕЙКА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, які на гэтым тыдні прыняў удзел у пасяджэнні Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі.**

— У Страсбургу былі праведзены сустрэчы з кіраўніцтвам Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы — са старшынёй гэтай арганізацыі Педра Аграмонтам, з генеральным сакратаром Войцехам Савіцкім, з кіраўніком дырэктарата Савета Еўропы Аляксандрам Гессэлем, дакладчыкам па Беларусі Андрэа Рыгоні, — адзначыў дэпутат. — Ва ўсіх гэтых сустрэчах лейтматывам было жаданне бачыць парламентарыяў нашай краіны ў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы.

Адказваючы на пытанне наконт таго, як еўрапейскія парламентарыі ставяцца да пашырэння ўзаемадзеяння з Беларуссю, Мікалай Самасейка сказаў, што іх настрой у дачыненні да нашай краіны ён назваў бы «асцярожным аптымізмам».

— Яны ўскладаюць вялікія надзеі на далейшае супрацоўніцтва з парламентам нашай краіны, — абгрунтаваў дэпутат. — Мы знаходзім усё больш пунктаў судакранання — не толькі па асноўных пытаннях, якія з'яўляліся цэнтральнымі на парадку дня нашага супрацоўніцтва, але і па іншых альтэрнатыўных кірунках, такіх як гандаль людзьмі, карупцыя, наркатрафік, праблемы міграцыі, змены ў выбарчым заканадаўстве.

**Чаму нашай краіне важна ўдзельнічаць у ПАСЕ?**

— Удзел у дзейнасці ПАСЕ, а на першым этапе гэта, натуральна, атрыманне статусу спецзапрошанага, даў бы нашай краіне магчымасць прысутнічаць на ўсіх еўрапейскіх пляцоўках з правам выказвання свайго погляду па любых пытаннях, — заявіў Мікалай Самасейка. — Гутарка аб аднаўленні статусу спецзапрошанага ішла на ўсіх сустрэчах. Але калі гэта можа здарыцца — не адкажа ніхто. Згодна з рэзалюцыяй ПАСЕ ад чэрвеня 2009 года, статус спецзапрошанага можа быць вернуты беларускаму парламенту толькі пры ўмове адмены або ўвядзення мараторыю на смяротнае пакаранне. Як на афіцыйных сустрэчах, так і ў кулуарах, размаўляючы з прадстаўнікамі ПАСЕ, я звярнуў увагу на тое, што, магчыма, цяпер яны і шкадуюць, што прынялі раней такую рэзалюцыю з канкрэтнай умовай, але еўрапейцы — гэта педанты, і, відаць, не трэба спадзявацца на тое, што яны адступяць ад гэтай умовы. Рэспубліцы Беларусь рана ці позна прыйдзецца вырашаць пытанне па гэтай праблематыцы для аднаўлення статусу спецзапрошанага.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# АГРАРНЫ БІЗНЕС — ГЭТА ГУЧЫЦЬ

**У ліку найбольш важных тэм на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў абмяркоўваліся перспектывы развіцця аграпрамысловага комплексу краіны ў рамках дзяржпраграмы развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады. Падчас абмеркавання прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ адзначыў, што стабільна высокія паказчыкі вытворчасці ўжо закладзены ў дзяржпраграму развіцця аграрнага бізнесу да 2020 года, а найбольш эфектыўныя праекты ў галіне атрымаюць дзяржпадтрымку.**



Фота БЕЛТА.

За апошнія дзесяць гадоў узровень спажывання асноўных прадуктаў харчавання ў краіне вырас на 12%. Аб'ёмы вытворчасці сельгаспрадукцыі на душу насельніцтва адпавядаюць узроўню развітых дзяржаў і па многіх пазіцыях перавышаюць паказчыкі краін ЕАЭС. У мінулым годзе экспарт прадуктаў харчавання ва ўмовах неспрыяльнай кан'юнктуры знешніх рынкаў склаў 4,4 млрд долараў, што на 1,2 млрд менш, чым у 2014-м, але ў 1,3 раза больш за ўзровень 2010 года. Удзельная вага экспарту прадуктаў харчавання ў агульным аб'ёме экспарту павялічылася з 13% у 2010-м да 17% у 2015 годзе. Таксама вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі за апошнюю пяцігодку ў гаспадарках усіх катэгорый павялічылася на 9%, у сельскагаспадарчых арганізацыях — на 14%. З 2010 па 2015 год у Беларусі пабудавалі 322 і рэканструявалі 1022 малочнатаварныя фермы. Таксама рэканструявалі 14 і пабудавалі 41 свінакомплекс. Тэмп росту рэалізацыі малака на заводы для перапрацоўкі ў 2015 годзе ў адносінах да 2010 года павялічыўся на 23%, жывёлы і птушкі — на 11%.

Прэм'ер-міністр заявіў, што дзяржпадтрымку ў выглядзе льготных крэдытаў атрымаюць суб'екты аграпрамысловага комплексу краіны, якія будуць выконваць мерапрыемствы дзяржпраграмы развіцця галіны. Пры гэтым на конкурснай аснове будуць адбірацца найбольш эфектыўныя з іх. Таксама прапануецца захаваць дзейсныя падыходы па патанненні працэнтаў. Дзяржава будзе кампенсаваць100% пры рэалізацыі праектаў у малочнай жывёлагадоўлі, агародніцтве і пладаводстве, таксама ў рыбагаспадарчай дзейнасці. У свінагадоўлі, птушкагадоўлі, селекцыі і насенняводстве, тэхнічным перааснашчэнні, выпрацоўцы сельгаспрадукцыі з бюджэту будзе кампенсавацца 50%. Андрэй Кабякоў адзначыў, што ў дзяржпраграму павінны быць закладзены мэтазгодныя аб'ёмы вытворчасці сельгаспрадукцыі з улікам патрэбнасці ўнутранага рынку і эфектыўнага экспарту.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ** *kryzhevich@zviazda.by*

# У «ШЭРУЮ» АРЭНДУ ЛЕПШ НЕ ГУЛЯЦЬ

**Пытанне аб павышэнні фіксаванай стаўкі падаходнага падатку для тых, хто здае кватэры на працяглы тэрмін, будуць разглядаць у сярэдзіне сакавіка. А пакуль можна паспець заплаціць падатак на год наперад і сэканоміць.**

## АПЛАЧАНАЯ ФІКСАВАНАЯ СТАЎКА ЎЛІЧВАЕЦЦА

Усё, наш чалавек пераканаўся, што хітрыць з падаткамі — сабе даражэй і вырашыў падлічыць даход ад наёмнага жылля за год. Калі агульная сума была больш за 43 млн 660 тысяч рублёў, тады трэба падаваць дэкларацыю. Напрыклад, агульная сума даходу, атрыманага ў 2015 годзе за здачу аднапакаёвай кватэры ў сталіцы, склала 50 млн рублёў. Цяпер такі даход падлягае падаткаабкладанню па стаўцы 13 працэнтаў.

Сума падаходнага падатку, вылічаная па падатковай дэкларацыі (разліку) за 2015 год, складзе 4 млн 460 тысяч рублёў. Адкуль яна ўзялася? Стаўка ў 13%, памножаная на 50 млн рублёў, дае 6,5 млн рублёў, ад якіх аднімаем 2 млн 40 тысяч рублёў, якія ў фіксаваных сумах заплаціў гаспадар аднапакаёвай кватэры на працягу 2015 года пры ўмове, што яго жыллё здавалася ў арэнду ў 3-й ці 4-й эканоміка-планіровачнай зонах Мінска.

## ШТРАФ — АД 105 ТЫС. ДА 2,1 МЛН РУБЛЁЎ

Парушэнне тэрміну прадстаўлення падатковай дэкларацыі (да 1 сакавіка) абкладаецца штрафам у памеры 2-х базавых велічынь з павелічэннем яго на 0,5 базавай велічыні за кожны поўны месяц пратэрмінoўкі, але не больш за 10 базавых велічынь. Такім чынам, цяпер памер штрафу складзе па такім парушэнні ад 420 тысяч рублёў да 2 млн 100 тысяч рублёў.

Другім пунктам тут можа стаць парушэнне тэрміну выплаты падаходнага падатку (да 15 мая 2016 года), вылічанага на падставе прадастаўленай падатковай дэкларацыі за 2015 год, калі незаплачаная або няпоўнасцю заплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню. У гэтым выпадку кліент атрымае штраф у памеры 15% ад нявыплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 базавай велічыні. Па такім варыянце памер штрафу складзе ад 105 тысяч рублёў і больш.

## СТАЎКУ ПАВЯЛІЧАЦЬ УЖО Ў САКАВІКУ

Пытанне аб павышэнні фіксаванай стаўкі падаходнага падатку для тых, хто здае кватэры на працяглы тэрмін, дэпутаты Мінгарсавета будуць разглядаць у сярэдзіне сакавіка. А сама падатковая інспекцыя збірае ўнесці свае прапановы па гэтым пытанні яшчэ да сярэдзіны лютага. А пакуль дзейнічаюць старыя стаўкі, таму можна паспець заплаціць падатак на год наперад і сэканоміць.

Калі гаспадар жылля афармляе дагавор, ён вырашае самастойна: плаціць падатак кожны месяц ці на год наперад. Звычайна скарыстацца правам аплаты падатку за ўвесь год можна да 1 студзеня. Аднак і потым памяняць схему можна, але для гэтага прыйдзецца скасаваць дагавор і заключыць новы, нават калі кватэраздымшчык застаўся ранейшым.

Пры такой аднаразовай аплаце ніякіх пераразлікаў пасля павелічэння стаўкі не будзе, удакладніце нюансы заканадаўства **першы намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску Надзея БОЛДЫРАВА**.

А пакуль памер такой фіксаванай стаўкі вар'іруецца ад 140 да 240 тысяч рублёў у месяц за кожны пакой у залежнасці ад эканоміка-планіровачнай зоны сталіцы. Напрыклад, апошняя і самая танная 5-я зона прадугледжвае стаўку — 140 тысяч рублёў. А чым бліжэй да цэнтра — тым вышэй стаўка.

Як істотна зменіцца стаўка падатку для тых, хто здае кватэры, у падатковай інспекцыі пакуль што не ўдакладняюць. Спецыяліст толькі адзначыла, што пры фарміраванні прапановы па павышэнні будзе ўлічаны ўзровень інфляцыі. Тут трэба згадаць, што за мінулы год інфляцыя ў нашай краіне склала 12%. Таму павелічэнне стаўкі адбудзецца мінімум менавіта на гэты паказчык. А пры такім раскладзе стаўка падатку для 1-й эканоміка-планіровачнай зоны складзе 270 тысяч, а для 5-й — 160 тысяч рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Каментарый у тэму

# ХАРЧОВАЯ КААПЕРАЦЫЯ

**На пасяджэнні Савета дзелавога супрацоўніцтва Санкт-Пецярбурга і Рэспублікі Беларусь былі падпісаны наменклатура і аб'ём харчовых паставак з Беларусі ў горад на Няве на бягучы год. З гэтай нагоды спецыяльна для «Звязды» Валерый ІВАНОЎ, старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў (Белкаапсаюз), расказаў пра асноўныя кірункі двухбаковага супрацоўніцтва і яго перспектывы:**

— У нас вялікі ўзаемны інтарэс. Па-першае, мы традыцыйна пастаўляем на рынак Санкт-Пецярбурга прадукты харчавання. Па-другое, сёння мы наладжваем сувязі ў пытаннях рэалізацыі пушніны. Бо Санкт-Пецярбург з'яўляецца своеасаблівым цэнтрам продажу і вытворчасці такога кшталту вырабаў у гэтым рэгіёне. Акрамя, напрыклад, Хельсінскага і Капенгагенскага аўкцыёнаў, ёсць яшчэ і Санкт-Пецярбургскі, які рэалізуе на працягу года 250—300 тысяч шкур. Мы прапанавалі 500 тысяч і атрымалі ў адказ шчырую зацікаўленасць у далейшым супрацоўніцтве.

Таксама працуем і ў кірунку арганізацыі імпарту. Пралічылі, што з прычыны курсавой розніцы і падзення курсу расійскага рубля выгадна некаторыя віды імпартных тавараў, якія не вырабляюцца ў Беларусі (напрыклад, электратавары, некаторая бытавая тэхніка), закупляць у Санкт-Пецярбургу. Гэта часам больш выгадна, чым закупляць у Кітаі. Тым больш што такім чынам мы дыверсіфікуем закупкі. Ды і якасць піцерскай прадукцыі значна вышэйшая. Таму працуем з некаторымі мясцовымі прадпрыемствамі, каб запоўніць недахоп тавараў, якія не вырабляем самі.

З аднаго боку, рынак Санкт-Пецярбурга, у тым ліку па гатовых вырабах (той жа пушніны), даволі шырокі. З іншага, шмат якія прадукты Белкаапсаюза таксама запатрабаваны ў Паўночнай сталіцы Расіі. Зараз мы маркуем адкрыць тут свае стацыянарныя гандлёвыя пункты.

Беларускі экспарт складае 90% тавараабароту паміж Белкаапсаюзам і горадам на Няве. На Савеце дзелавога пасяджэння мы прапанавалі асартымент нашай мясцовай прамысловасці: кансервы з агародніны, вырабы з мяса, паўфабрыкаты, грыбы, ягады — усяго тры дзясяткі найменняў. Гэтай прапанованай нашы піцерскія калегі таксама шчыра зацікавіліся.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ІНТЭРНЭТ-АЛІМП ЧАКАЕ САІСКАЛЬНІКАЎ

**Стартаваў прыём заявак на XIV конкурс «Інтэрнэт-прэмія ТІБО-2016».**

Конкурс у 2016 годзе праводзіцца па 12 асноўных намінацыях: «Органы дзяржаўнага кіравання», «Адукацыя і навука», «Інфармацыйны рэсурс», «Карпаратыўны інтэрнэт-рэсурс», «Інтэрнэт-крамы», «Культура і мастацтва», «Спорт, турызм і забавы», «Здароўе і медыцына», «Для дзяцей і юнацтва», «Іншамоўны інтэрнэт-рэсурс пра Беларусь», «Арыгінальны інтэрнэт-рэсурс», «Інтэрнэт-рэсурс банкаўска-крэдытных устаноў». Акрамя гэтага журы адзначыць лепшы з заяўленых рэсурсаў па дызайне, змесце і тэхналагічнасці.

Інтэрнэт-прэмія «ТІБО» прысуджаецца сеткавым работам, створаным у беларускім сектары інтэрнэту за важкія мастацкія, тэхналагічныя і сацыякультурныя дасягненні ў галіне інфармацыі, культуры, мастацтва і адукацыі.

Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца ў рамках міжнароднага форуму «ТІБО-2016» , які пройдзе з 19 да 22 красавіка 2016 года ў Футбольным манежы ў Мінску. Арганізатары «ТІБО» абяцаюць забяспечыць прамую інтэрнэт-трансляцыю цырымоніі ўручэння прэміі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ГАЗАВЫЯ ПРЫБОРЫ — ДА АГЛЯДУ!

**Рашэнне пазапланава праверыць тэхнічны стан усіх прыбораў, якія, працуючы на газе, падаграюць ваду, было прынята пасля трагедыі ў Барысаве, якая здарылася тыдзень таму. Нагадаем, тады ў дзвюх кватэрах шматпавярховага дома загінулі шэсць чалавек.**

— Аб'яднанне «Белпалівагаз» даручыла ўсім падначаленым газазабеспячальным арганізацыям праверыць, на колькі бяспечна працуюць праточныя водагазанагравальнікі ў шматпавярховых дамах, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства энергетыкі Жанна ЗЯНЬКЕВІЧ**. — Кожны карыстальнік гэтага абсталявання пройдзе абавязковы пазапланавы інструктаж па Правілах карыстання газам у быце.

Арганізацыі, якія забяспечваюць падачу газу ў астатні жылы фонд, абследуюць і іншае абсталяванне, якое працуе па блакітным полымі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Тэхналогіі

# ТУРЫСТЫЧНЫ АНЛАЙН-СУПЕРМАРКЕТ

**Нацыянальнае агенцтва па турызме плануе запусціць партал з магчымасцю браніравання турпаслугі анлайн. На ім будзе прадугледжана сістэма рэзервавання тураў, экскурсій, пералётаў, пераездаў, гасцініц, санаторыяў і аграсядзіб.**

Распрацоўшчыкі разлічваюць стварыць сайт, які б прадастаўляў паслугі па прынцыпе папулярнага рэсурсу booking.com, што дазваляе забраніраваць гатэль або пералёт у многія часткі свету. Для гэтага супрацоўнікі агенцтва хочуць размясціць інфармацыю аб усіх турыстычных паслугах краіны на адной пляцоўцы. А гэта добрая магчымасць зрабіць беларускі турызм больш вядомым і прывабным. Дарэчы, цікава і тое, што на новым партале можна будзе не толькі забраніраваць нумар у гатэлі ці аграсядзібе, але і нават купіць білет у тэатр.

Рэсурс будзе таксама даваць магчымасць аплочваць паслугу анлайн. Як паведамілі ў Нацыянальным агенцтве па турызме, зараз яны выбіраюць партнёра, які б дапамог распрацаваць і аптымізаваць гэтую сістэму. Таксама важна акрамя тэхналогій і само напаўненне інтэрнэт-рэсурсу. На партале трэба будзе прадставіць толькі якасныя паслугі. Гэта азначае, што пасля запуску сайта неабходна будзе яшчэ зрабіць вялікую працу па яго прасоўванні: прыцягнуць да ўдзелу як мага больш туркампаній і партнёраў. Партал у сваю чаргу павінен быць эмацыйным і негрувасткім. Распрацоўшчыкі плануюць прадставіць яго на розных мовах. У перспектыве будуць версіі на рускай і англійскай, асобны кантэнт перавядуць на кітайскую і нямецкую. Аб беларускай версіі размова пакуль што не вялася.

Акрамя таго, супрацоўнікі агенцтва плануюць стварыць спецыяльны дадатак для смартфонаў, каб любы турыст, выкарыстоўваючы гаджэт, мог атрымаць неабходную яму інфармацыю або набыць тавар. Сёлета ведамства таксама не пакіне без увагі і дзейнасць у сацсетках. Падпісчыкаў старонак у «Facebook» і «УКантакце» будуць рэгулярна інфармаваць аб апошніх навінах, падзеях і мерапрыемствах турыстычнай сферы краіны. З'яўленне новага турпартала чакаецца ў канцы сакавіка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Грамадства

# НАС СТАЛА БОЛЬШ

**Мінск і Мінская вобласць сталі ў мінулым годзе лідарамі па колькасці нованароджаных. Як інфармуе сайт Нацыянальнага статыстычнага камітэта, летась у сталіцы нарадзілася 22 832 немаўляці, у Мінскай вобласці — 19 160.**

У цэлым жа колькасць насельніцтва нашай краіны за мінулы год вырасла і склала 9498,7 тысячы чалавек, што амаль на 18 тысяч больш у параўнанні з мінулым годам. У 2015 годзе ў Беларусі нарадзілася 119 509 дзяцей — на 975 больш, чым у 2014-м.

Міграцыйны прырост насельніцтва за мінулы год перавысіў 18 тысяч чалавек, у параўнанні з пазамінулым гэтая лічба павялічылася ў 1,2 раза. Асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываўся з краінамі СНД — больш за ўсё да нас ехалі з Украіны, Расіі і Казахстана.

У 2015 годзе ў нашай краіне зарэгістравана больш за 82 тысячы шлюбаў, афіцыйна скасавалі шлюб за гэты перыяд амаль 32 тысячы сем'яў. У параўнанні з 2014 годам колькасць разводаў зменшылася на 5,4%.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ**

■ Добрая навіна

# ПРАФЕСІЙНЫХ ХАКЕІСТАЎ І ФІГУРЫСТАЎ

## БУДУЦЬ РЫХТАВАЦЬ У ЖОДЗІНЕ

**На Лядовай пляцоўцы, якую ўзвялі ў Жодзіне пазалетась, для гэтага плануецца адкрыць аддзяленні спартшкол па хакеі і фігурным катанні.**

— На базе Лядовай пляцоўкі дзяцей ужо навучаюць фігурнаму катанню і хакею, — кажа **старшыня Жодзінскага гарвыканкама Міхаіл АМЕЛЬЯНЧУК**. — Думаю, у будучыні магчыма стварэнне школы хакея, а, можа, і фігурнага катання. Для нас галоўнае, каб яна была запатрабаванай.

Цяпер секцыю па фігурным катанні наведваюць дзеці ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў, па хакеі — хлопцы ад 5 гадоў. Заняткі праходзяць на жодзінскай Лядовай пляцоўцы два разы на тыдзень па кожнай з секцый асобна, але пакуль на платнай аснове.

Дакументы на адкрыццё аддзялення па хакеі ў адной са спартыўных школ Жодзіна зараз знаходзяцца на ўзгадненні ў Міністэрстве спорту і турызму. Пры ўмове станоўчага вырашэння пытання, заняткі будуць праходзіць на бясплатнай аснове, аднак бацькам юных хакеістаў неабходна будзе набыць першапачатковую экіпіроўку за ўласныя сродкі. Спецыялісты аддзела адукацыі, спорту і турызму Жодзінскага гарвыканкама запэўнілі, што трэнерска-выкладчыцкі склад падабраны і гатовы прыступіць да працы.

Усяго ў Жодзіне працуюць тры дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, у якіх найбольшай папулярнасцю карыстаюцца веславанне на байдарках і каноэ, дзюдо, самба, лёгкая і цяжкая атлетыка, футбол.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# На ракаў — толькі з пасткамі

## І не падчас веснавой забароны на здабычу рыбы

**У Правілы здабычы дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства, унесены змены. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**



Названыя правілы, зацверджаныя пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2006 года №699 (у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 студзеня 2016 года №36), рэгулююць парадак і ўмовы здабычы дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства — рака доўгапальцага, вінаграднага смаўжа, лічынак хіранамід (матыля) і іншых.

Асноўныя змены закранулі працэдуры прадастаўлення права на нарыхтоўку і (або) закупку дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства. З 22 студзеня юрыдычныя асобы, што плануюць гэта рабіць, на працягу 15 дзён з моманту пісьмовага звароту ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган павінны быць праінфармаваны аб тэрмінах апублікавання паведамлення аб правядзенні таргоў або атрымаць адмову ў іх правядзенні. Прычынамі для адмовы можа быць толькі адсутнасць запасу дзікіх жывёл, якія не адносяцца да аб'ектаў палявання і рыбалоўства, пацверджанага заключэннем Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі або прадастаўленне такога права іншай юрыдычнай асобе ці індывідуальнаму прадпрымальніку.

Тэрміны забароны на лоўлю рака доўгапальцага і лічынак хіранамід (матыля) прыведзены ў адпаведнасць з тэрмінамі веснавой забароны на вылаў усіх відаў рыб, устаноўленых Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства — у рыбалоўных угоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей з 20 сакавіка па 18 мая, Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей — з 1 красавіка па 30 мая, Віцебскай вобласці — з 10 красавіка па 8 чэрвеня.

Для лоўлі ракаў грамадзянам забаронена выкарыстоўваць якія-небудзь прылады здабычы, акрамя спецыяльных пастак, забаронена лоўля ракаў з выкарыстаннем асвятляльных прыбораў і (або) плавальных сродкаў і лоўля рукамі ў цёмны час сутак, а таксама лоўля яйцаносных самак і самак з лічынкамі на працягу ўсяго года.

Акрамя таго, пастановай прадугледжана ўказанне на пастках, якія належаць юрыдычным асобам, назвы юрыдычнай асобы, а таксама даты і нумару рашэння аб прадастаўленні ёй права на здабычу і (або) нарыхтоўку ракаў, і іншыя змены.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает об отмене введения срочного отзывного банковского вклада в белорусских рублях «Сберегательный «Пенсионный» на условиях, указанных в газете «Звязда» № 5 от 13.01.2016.
В случае принятия решения о введении вклада «Сберегательный «Пенсионный», информационное сообщение будет опубликовано дополнительно.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»,**
***опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181,***
**строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, **нежилого помещения на 2 этаже –** *1500 (одна тысяча пятьсот) долларов США».*

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704.
Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 153 33 24, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

ОАО «Большевик-Агро» а/г Кривичи Солигорского района Минской области
ПРОИЗВОДИТ ЗАКУПКУ У НАСЕЛЕНИЯ И ОРГАНИЗАЦИЙ
МОЛОДНЯКА
КРУПНОГО РОГАТОГО СКОТА
ВЕСОМ ОТ 50 ДО 100 КГ.

Цена договорная.
Тел.: 8 (017 4) 291 696, факс 8 (017 4) 291 686.
УНП 600061511

■ Вайсковыя рытуалы

# НАБРАЦЬ ВЫШЫНЮ

## Адбыўся чарговы выпуск авіяцыйных спецыялістаў ваеннага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі

**Больш за іх вучацца толькі ўрачы. 22 кадравыя афіцэры, 8 прапаршчыкаў і 21 афіцэр запасу атрымалі дыпломы падчас урачыстай цырымоніі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**



Фота БЕЛТА.

Упершыню авіяцыйныя спецыялісты пакінулі сцены навучальнай установы ў іншым статусе — летась Мінскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж быў пераўтвораны ў Беларускую дзяржаўную акадэмію авіяцыі.

— Тое, што афіцэры і прапаршчыкі атрымліваюць свае званні ў той час, калі ўстанова адукацыі знаходзіцца ў новым статусе, надзвычай важна, — лічыць **рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі Рыгор ЛАЎШЭНКА**. — Павялічваецца значнасць атрыманых ведаў і ўменняў, а магчымасці і перспектывы навучэнцаў набываюць новая якасці.

За 40 гадоў існавання ваеннага факультэта па праграмах афіцэраў запасу падрыхтавана некалькі тысяч спецыялістаў грамадзянскай авіяцыі, 206 прапаршчыкаў. Толькі за апошнія пяцігоддзе са сцен ВНУ выпушчана 117 кадравых афіцэраў для Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны.

**Прарэктар акадэміі па дзяржаўнай авіяцыі — начальнік ваеннага факультэта Уладзімір СІЛІН** ганарыцца сённяшнімі выпускнікамі. «Асабіста для мяне гэта ўнікальны выпуск, бо кожнага ведаю — ад набору да завяршэння адукацыі, — гаворыць палкоўнік. — Упэўнены, што з іх атрымаюцца добрыя спецыялісты».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ На слыху

# ВЯСЕЛЛЯ НЕ АТРЫМАЛАСЯ...

## Замежнік застаўся і без грошай, і без «нявесты»

**За махлярства ў дачыненні да грамадзяніна Турцыі супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС затрымалі 23-гадовую мінчанку.**

Зламысніца пазнаёмілася з замежным грамадзянінам на адным з сайтаў. Доўгі час паміж імі ішла актыўная перапіска, пакуль турак не прапанаваў сваёй віртуальнай знаёмай выйсці за яго замуж і пераехаць. Але спачатку мужчына сам прыбыў у нашу краіну да меркаванай нявесты. Падчас спаткання замежнік звярнуў увагу, што дзяўчына апранута даволі сціпла. Таму было вырашана выправіцца ў гандлёвы цэнтр «Сталіца», дзе госць набыў для яе паліто. Пасля мужчына даў зламысніцы сто долараў на асабістыя расходы і завёў размову пра неабходнасць зняць жыллё для сумеснага пражывання да таго часу, пакуль не будуць вырашаны ўсе фармальнасці з выездам нявесты ў Турцыю. Дзяўчына пераканала яго ў тым, што самастойна вырашыць усе пытанні, звязаныя з арэндай кватэры, пасля чаго ўзяла ў «жаніха» 400 долараў. І знікла. Паводле інфармацыі Ленінскага РУУС г. Мінска, затрыманая ўжо неаднойчы судзімая за аналагічныя, а таксама маёмасныя злачынствы.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# З ВЫШЫНІ ПТУШЫНАГА ПАЛЁТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У такім маштабе выдатныя мясціны нашай краіны яшчэ ніхто не паказваў. Цэлы год ва ўсіх раёнах, гарадах, вёсках ішла праца, каб знайсці і ўзняць на паверхню тое, што было яшчэ невядома, — заўважае **генеральны дырэктар «Беларустурыста» Людміла СЯНЬКОЎСКАЯ**. — Думаю, для замежных турыстаў цікава знаёмства не толькі з тымі знакамітымі мясцінамі, якія шырока разрэкламаваныя ў краіне, але і адкрыццё новых, зусім нязведаных».

Але мэта выставы, арганізатарамі якой выступілі Федэрацыя прафсаюзаў, кампанія «Беларустурыст» і УП «Белпрафсаюзкурорт», — не толькі прыцягнуць увагу замежнікаў, куды важней развіваць унутраны турызм. «Мы паставілі сабе задачу адрадзіць цікавасць да экскурсійнага турызму па роднай краіне. Некалі ў прафсаюзаў былі вельмі моцныя традыцыі ў гэтым плане, людзі цэлымі калектывамі падарожнічалі па радзіме, даведваліся многа новага і цікавага, адпачывалі, атрымлівалі непаўторныя эмоцыі. Усё гэта па-сапраўднаму згуртоўвала іх», — адзначыў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА**.

Варта заўважыць, што сёння знавальны адпачынак у Беларусі становіцца дступным і разнастайным. Летась ФПБ абвясціла конкурс «Беларусь у новым аблічны», у межах якога раённыя і гарадскія арганізацыі прафсаюзаў распрацоўвалі новыя экскурсійныя маршруты. 80 навінак — цікавых, насычаных інфармацыяй, эмацыйна афарбаваных, аздобленых анімацыйнымі праграмамі ўжо чакаюць сваіх турыстаў. У падрыхтоўцы новага турыстычнага аблічча Беларусі было задзейнічана шмат людзей, сярод якіх работнікі музеяў, дамоў культуры, аматары гісторыі. Сярод унікальных праектаў — падарожжы — знаёмствы з крыніцамі і крыжамі. Магчыма, знойдуцца ахвотныя выправіцца ў «Падарожжа па Ігуменскім тракце» — па задуме аўтараў праекта нібыта разам з паштовай службай XIX стагоддзя вам неабходна даставіць ліст у павятовы горад. Клічаўскае і Акцябрскае раённыя аб'яднанні прафсаюзаў запрашаюць у партызанскія зоны, экскурсіі будуць праходзіць у інтэрактыўнай форме, не абыдзецца без тэатралізаваных прадстаўленняў, партызанскай ежы, гатаванай на вогнішчы, і нават прыпевак, прыдуманых у час Вялікай Айчыннай вайны. Прадстаўнікі Хоцімска — самага ўсходняга райцэнтра — прапануюць пачаць пазнаваць Беларусь з мясцін, адкуль узыходзіць сонца, праект «Далёкі ўсход Беларусі» — знаёмства з населенымі пунктамі нашай радзімы, якія адными з першых былі вызвалены ад нямецкіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне. На Дзятлаўшчыне чакаюць людзей, што цікавяцца легендамі, на Лагойшчыне — аматараў беларускай літаратуры, у Мёрах сустрэнуць падарожнікаў, якія наведаюць экасцежку «Ельня». Пры жаданні можна падарожнічаць на аўтобусах, веласіпедах, пешшу, сплаўляцца на байдарках. Прэзентацыя найлепшых праектаў, якая праводзілася ў межах выставы «Прафтур-2016», па сутнасці ператварылася ў фестываль з песнямі, танцамі, тэатралізаванымі элементамі, пачастункамі. Карацей, тут можна было не толькі пачуць пра турыстычныя навінкі, але і адчуць атмасферу, у якую акунуцца будучыя падарожнікі, пазнаёміцца з цікавымі, вясёлымі, улюбёнымі ў свой край людзьмі, нават тымі, якія захоўваюць асаблівасці гаворкі свайго рэгіёна. «Мы прынцыпова гаворым на гэтай мове, каб не прапала, гэта таксама ўнікальная каштоўнасць нашага краю, паўднёвага захаду Брэстчыны, — расказвае **Наталля ДЫРМАН**, якая прадстаўляе **Хмелеўскі дом культуры Жабінкаўскага раёна**. — У нас кажуць «скрысь» — усюды, «навылёт» — наскрозь, «швардун» — вязаная кофта з кішэнькамі на гузіках, «тыглік» — патэльня на трох ножках, «колышні» — колішнія. А яшчэ ў нас шмат фестываляў ладзіцца і людзі такія, што нават калі вы транзітам будзеце ехаць, сустрэнуць, пачастуюць і ўсё раскажуць».



«Сужэнцы Тышкевічы».

Сучасны турыст можа не толькі замаўляць экскурсіі па прыкладзеных маршрутах, але і заказваць праграму пад сябе. Сёння ўжо падрыхтаваны каталогі па ўсіх абласцях краіны, дзе прадстаўлена інфармацыя па розных выдатных мясцінах Беларусі, і любы ахвотны можа выбраць менавіта тыя аб'екты, якія яму цікавыя.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



Фрагмент рэканструкцыі падзей Першай сусветнай вайны.

## 5 ПРАПАНОЎ ТУРЫСТАМ:

**Валерыя КАЗАКОВА, вядучы спецыяліст упраўлення турыстычна-экскурсійнай работы і турпаслуг «Беларустурыста»:** «Мы прапануем каля 30 новых маршрутаў. Сёння можна пабываць у Мінску нефармальным — пазнаёміцца са сталічным светам андэграўнда, а маршрут «Небыліцы аб сталіцы» — новая праграма з анімацыйнымі элементамі, якая завабліве гарадскімі легендамі. Таксама мы распрацавалі падарожжа па мястэчках, дзе захавалася спадчына яўрэйскай культуры».

**Аляксандр ІСАКАЎ, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Беларускага музея архітэктуры і побыту:** «На тэрыторыі музея ўжо з'явілася ўзлётна-пасадачная паласа, і сёння можна палятаць над скансэнам на планеры і ўбачыць цудоўныя краявіды з вышыні птушынага палёту. Яшчэ адна навінка — водная экскурсія па возеры, што знаходзіцца побач з музеем пад адкрытым небам, з наведваннем руін касцёла Сэрца Ісуса».

**Алена ВЕРАБЕЙ, заснавальнік фонду «Фартыфікацыя Брэста», камісар групы ваенна-гістарычных рэканструктараў «Рубеж»:** «У нашых маршрутах, якія знаёмяць з фартыфікацыйнай спадчынай, задзейнічаны некалькі аб'ектаў, сярод якіх сядзіба Нямцэвічаў, дзе амаль завершана рэстаўрацыя. Тут збіраюцца людзі ва ўніформе і рэстаўруюца падзеі Першай сусветнай вайны. Мы прапануем экскурсію-анімацыю «Тайна форта «Літэра А», каб пазнаёміцца з цікавым аб'ектам фартыфікацыі, які захаваўся. Гэта экскурсія абуджае цікавасць да ваеннай гісторыі ў школьнікаў, тут яны могуць пастраляць з вінтовак, пакідаць муляжы гранат, паспаборнічаць, пераапрануцца ў ваенную форму розных эпох, нават адшукаць скарбы і ўзяць ваеннапалоннага. На кожным этапе падарожнікі сустракаюцца з экскурсаводамі, якія знаёмяць з ваеннай гісторыя часоў Першай і Другой сусветных войнаў, прычым апранутых у адпаведную форму. Таксама мы можам арганізаваць экскурсіі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі».

**Вольга ПЕТРАШОВА, намеснік старшыні Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў:** «Калі ў нашым раёне ў 2014 годзе было 12 экскурсійных маршрутаў, сёння іх 364! Гэта і пешаходныя, і веласіпедныя, і водны (па Дняпры), і конны. Шмат паломнікаў у Пустынскі Успенскі манастыр у Мсціслаўскім раёне, дзе ў нашы дні праявіўся лік Хрыста. Створаны маршруты і да жыватворных крыніц. Самай буйной ва Усходняй Еўропе з'яўляецца Блакітная крыніца ў Слаўгарадскім раёне, дзе вада б'е з глыбіні больш як 200 метраў і вадзяная плынь складае 60 літраў за секунду. Кажуць, што гэта ўнікальная мясціна, дзе вялікая колькасць людзей вылечваецца. Крыніц у нас многа — самыя знакамітыя ў Пустынках і Палыкавічах. Зараз вядзём пошукавую дзейнасць, аднаўляем і ўпрыгожваем крыніцы, бо яны запатрабаваныя людзьмі».

**Вадзім БАРАБАНАЎ, старшы навуковы супрацоўнік «Гомельскага палацава-паркавага ансамбля»:** «Сумесна з «Гомельтурыстам» распрацаваны «Фельдмаршальскі маршрут», у межах якога вы наведаеце цудоўны палац, пазнаёміцеся з унікальнай калекцыяй рэчаў, якія належалі былым уладальнікам. Гасцей сустрэнуць сужэнцы Паскевічы (экскурсаводы ў прыгожых касцюмах), разам з імі на тэрасе палаца вы зможаце выпіць гарбаты і пагаварыць. Акрамя выдатных мясцін Гомеля ўдзельнікі экскурсіі змогуць пазнаёміцца са старажытнай Веткай і культурай стараабрадніцтва».

■ Кітайскія сімвалы

# ПЫТАННІ ДА НЕБА

### Пабачыла свет кніга вершаў класіка кітайскай паэзіі Лі Хэ на беларускай мове

**Калі хто памятае песні групы Pink Floyd, то, магчыма, і такі твор яму вядомы — «Set the Controls for the Heart of the Sun». І ёсць там радкі: «Глядзі на таго, хто крычыць у сцяну, Кідаючы свае пытанні да неба». Гэтыя словы прыйшлі ў песню з верша старажытнага кітайскага паэта Лі Хэ (790—816).**

Цяжка сабе ўявіць, што столькі гадоў мастацкае слова вандруе з адных вуснаў у другія. Хоць у кітайскай паэзіі ёсць і іншыя ўражальныя прыклады. Першы з вядомых кітайскіх паэтаў — Цюй Юань (нарадзіўся ў 340-м годзе да нашай эры). У Кітаі існуе такі звычай: пяты дзень пятага месяца называюць «свята драконавых лодак» — гэты дзень лічыцца днём гібелі Цюй Юаня. Людзі садзяцца ў лодкі, якія ўпрыгожаны драконамі, і плаваюць па рэках з паходнямі і ліхтарыкамі. Лічыцца, што і праз тысячагоддзі людзі сімвалічна шукаюць у вадзе цела паэта.




Першая «сустрэча» Лі Хэ з беларускім чытачом праз асобную кнігу «Песня бамбукавай флейты» адбылася па заказе і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі. Зборнік — частка той шырокамаштабнай праграмы беларуска-кітайскіх кнігавыдавецкіх узаемадачыненняў, якая рэалізоўваецца ўжо не першы год.

Вершы Лі Хэ перакладзены з мовы арыгінала. Укладанне кнігі ажыццявіла літаратуразнаўца, паэтэса, перакладчык Юлія Алейчанка. Перакладчыкам большасці вершаў выступіла старшы выкладчык кафедры моваЗнаўства і краіназнаўства Усходу факультэта міжнародных зносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Алена Раманоўская. Яна ж і аўтар грунтоўнага біяграфічнага нарыса пра Лі Хэ. Сярод іншых перакладчыкаў паэзіі легендарнага творцы — Юлія Алейчанка, Таццяна Сівец, Леанід Дранько-Майсюк.

Зборнік, які выйшаў у Выдавецкім доме «Звязда», — працяг серыі кніг кітайскай паэзіі на беларускай мове «Светлыя знакі. Паэты Кітая». У 2014—2015 гадах пабачылі свет асобныя выданні твораў Ван Вэя, Лі Бо, Ду Фу, Ай Ціна. Між іншым, існуе міжнародны рэдакцыйны савет серыі, у склад якога поруч з беларускімі кнігавыдаўцамі, паэтамі і перакладчыкамі ўваходзяць кітайскія калегі — намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ Лю Сулін, кіраўнік Усекітайскага таварыства па ахове аўтарскіх праваў Чжан Хунба, выкладчыкі 2-га Пекінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Чжан Хуэйцінь, Лю Мяа, славуты кітайскі перакладчык славянскіх літаратур Гаа Ман (дзякуючы яму ў Кітаі выйшлі кнігі народнага паэта Беларусі Максіма Танка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч).

**Сяргей ЗАЛАМАЙ**

■ Рэйтынгі

# ВЕДЫ... З ЭЛЕКТРОННАГА СХОВІШЧА

**Электронная бібліятэка БДУ ўвайшла ў сотню лепшых універсітэцкіх бібліятэк свету. Па звестках апошняга рэйтынгу «Ranking Web of World Repositories» яна размясцілася на сотым месцы сярод бібліятэк універсітэтаў і заняла 114-е месца сярод усіх уключаных у рэйтынг інфармацыйных рэсурсаў.**

Акрамя таго, электронны рэпазіторый БДУ заняў другое месца ў рэйтынгу бібліятэк краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Усяго было праранжыравана каля 2 тысяч 300 рэсурсаў.

Як патлумачылі ў прэс-службе БДУ, методыка рэйтынгу ўключае ацэнку колькасці дакументаў, загружаных у электронную бібліятэку; колькасць знешніх спасылак на рэсурсы; колькасць загружаных файлаў; «вагу» навуковых публікацый па дадзеных Google Scholar.

Фундаментальная бібліятэка БДУ адна з першых у Беларусі распачала працу па рэгістрацыі ў сусветных базах даных паўнатэкставых навуковых публікацый, навучальных і метадычных матэрыялаў навукоўцаў і выкладчыкаў універсітэта, а таксама часопісаў, якія выдаюцца ў БДУ. Акрамя таго, бібліятэка Белдзяржуніверсітэта ўкараніла працэс пераводу наяўных у сваім фондзе дакументаў у электронны фармат, што дазволіць у далейшым зрабіць іх даступнымі для ўсёй сусветнай супольнасці. У цяперашні час, дзякуючы сумеснай працы Фундаментальнай бібліятэкі і ўсіх структурных падраздзяленняў універсітэта, у сховішчах электроннай бібліятэкі БДУ знаходзіцца каля 85 тысяч паўнатэкставых публікацый навукоўцаў і выкладчыкаў універсітэта (у 2013 годзе іх было 40 тысяч).

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
4 ЛЮТАГА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15786)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Валерыя САДОЎСКАЯ:

# «ЗНАЙСЦІ СВАЮ НІШУ ЦЯЖКА, АЛЕ МАГЧЫМА»



**Валерыя Садоўская, вядомая нам па такіх праектах, як «Акадэмія талентаў», «Голас краіны», а таксама як фіналістка сёлетняга нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне-2016», не адразу прыйшла да разумення, што перамога чакае цябе не толькі тады, калі ты выйграеш. Як спявачцы сёння жывецца на дзве краіны, што, акрамя творчасці, звязвае яе з украінскай сталіцай і чаму яна вырашыла адправіцца ў вольнае плаванне — пра гэта Валерыя расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад адбору на «Еўрабачанне-2016»? Якія падводныя камяні чакаюць там артыстаў?***

— Я ўдзельнічала ў нацыянальным адборы на гэты конкурс ужо другі раз і магу сказаць, што час падрыхтоўкі да выступлення — самы плённы і цікавы перыяд у маім жыцці. Бо ідзе такая праца, ажыццяўляюцца такія ідэі, якія, мабыць, ніколі не ўзніклі б у звычайны час. Тыя ж інтэрв'ю, эфіры на радыё і тэлебачанні — яны загартоўваюць выканаўцаў. Таму, нават не выйграўшы адбор, ты набываеш каласальны вопыт, які ў будучыні табе неаднойчы дапаможа.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Не вучобай адзінай

# СТУДЭНТ, ПРАБЛЕМЫ?

## ПЛЯЧО ПАДСТАВІЦЬ ПРАФКАМ



**Рашэнне аб стварэнні Маладзёжнага савета пры Беларускім прафсаюзе работнікаў адукацыі і навукі было прынята на III пленуме Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза. Узначаліў яго Міхаіл Барэйша — старшыня прафсаюзнага камітэта студэнтаў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Мяркуецца, што Маладзёжны савет будзе акумуляваць перспектыўныя ідэі і прапановы па рэалізацыі маладзёжнай палітыкі і агучваць праблемы навучэнскай і працоўнай моладзі.**

**У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў пленуму аказаліся сацыяльныя гарантыі моладзі, аздараўленне студэнтаў, падтрымка маладых спецыялістаў, інфармацыйная дзейнасць прафсаюза і многія іншыя.**

### З марай пра інтэрнат

— Студэнцкі прафсаюз — унікальная арганізацыя, якая дзейнічае ў інтарэсах студэнтаў і мае магчымасць гаварыць на роўных як з кіраўніцтвам універсітэта, так і са студэнтамі. З правамі і паўнамоцтвамі, што нарматыўна ўрэгуляваны ў пагадненнях з установамі адукацыі. Трэба разумець, што фактычна ніводнае пытанне, якое тычыцца студэнтаў, не вырашаецца без уліку меркавання студэнцкага прафкама, — падкрэслівае **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Прафсаюз уключае сваіх прадстаўнікоў ва ўсе ўніверсітэцкія камісіі, дзейнасць якіх закранае пытанні вучэбна-выхаваўчага працэсу і стыпендыяльнага забеспячэння, сацыяльныя і жыллёва-бытавыя пытанні. Маніторыць умовы пражывання студэнтаў. Удзельнічае ў распрацоўцы правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах, палажэнняў аб засяленні студэнтаў у інтэрнаты, у размеркаванні месцаў. Адлічэнне навучэнцаў — членаў галіновага прафсаюза не прыцягненне іх да дысцыплінарнай адказнасці таксама не дапускаецца без ўзгаднення з прафкамам навучэнцаў.

...Кожны першакурснік, які прыехаў вучыцца ў Мінск з іншага горада, скажа вам, што паступіць у сталічную ВНУ — толькі палова справы. Не менш важна атрымаць у інтэрнаце месца. Вось чаму забеспячэнне студэнтаў жыллём заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі як Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, так і Міністэрства адукацыі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

У чаканні галоўнага

# Размеркаванне: павіннасць ці прывілея?

### Знайсці першае працоўнае месца становіцца ўсё больш складаным

**Ці зможа рынак працы прыняць усіх выпускнікоў у эканамічна складаны год, калі многія прадпрыемствы і кампаніі імкнуцца максімальна скараціць свае выдаткі, у тым ліку скарачаюць і персанал? Якіх спецыялістаў чакаюць наймальнікі? І чаму заробак для учарашняга студэнта — не галоўнае? Гэтыя пытанні абмяркоўваліся падчас «круглага стала», які прайшоў у Беларускім дзяржаўным універсітэце.**

### ДВАЙНЫ ВЫПУСК

Трэба заўважыць, што сітуацыя з пошукам першага працоўнага месца была актуальная і для леташніх выпускнікоў. А ў 2017 годзе яна і ўвогуле абвастрыцца: з устаноў адукацыі выйдуць маладыя спецыялісты, якія навучаліся і па пяцігадовай праграме вышэйшай школы, і па абноўленай чатырохгадовай. Такім чынам, колькасць выпускнікоў павялічыцца ўдвая.

Летась большасць кампаній не ставілі перад сабой задачу развіцця і пашырэння: іх галоўнай мэтай было захаваць пазіцыі ці проста выжыць.

— Асноўныя рынкі, куды пастаўляем прадукцыю, «праселі», — канстатуе **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і персанале ЗАТ «Атлант» Аляксандр МАШКО.** — Таму свае планы па прыёме маладых спецыялістаў мы скарацілі ў два разы.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
4 02 2016 г.

Карысны рэсурс

# БАЗА ДЛЯ РЭЗЮМЭ

## У ДАПАМОГУ ВЫПУСКНІКАМ І НАЙМАЛЬНІКАМ

**Электронная база рэзюмэ выпускнікоў-радыёфізікаў запушчана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Гэты праект скіраваны на стварэнне аптымальных умоў па пошуку маладымі спецыялістамі першага працоўнага месца і прадастаўленне працадаўцам магчымасці дэталёва пазнаёміцца з патэнцыяльнымі супрацоўнікамі.**

База рэзюмэ разлічана ў першую чаргу на прадпрыемствы, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у галіне радыётэхнікі, радыёэлектронікі, тэлекамунікацый і інфарматыкі.

Рэсурс складаецца з анкет пяцікурснікаў факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, якія сёлета атрымаюць дыплом. Пры гэтым размяшчэнне заявак ажыццяўляецца па жаданні самога студэнта. Скарыстацца яго паслугамі могуць студэнты як бюджэтнай, так і платнай формаў навучання.

База штодня папаўняецца новымі рэзюмэ. Усе анкеты змяшчаюць апісанне навуковай дзейнасці, узровень валодання замежнымі мовамі, камп'ютарнымі і прафесійнымі навыкамі, а таксама дадатковую інфармацыю пра захапленні і хобі. Навігацыя сэрвісу дазваляе хутка азнаёміцца са звесткамі прэтэндэнтаў, а таксама падабраць кандыдата з улікам патрабаванняў наймальніка.

Ініцыятарам і распрацоўшчыкам базы рэзюмэ выступіў факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій (ФРКТ) БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

# Размеркаванне: павіннасць ці прывілея?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Але, на думку экспертаў, не ўсё так песімістычна. Прынамсі, колькасць вакансій у сферы «пачатак кар'еры» за апошні год вырасла на 27,6 працэнта. Пры гэтым суіскальнікаў стала больш на 75 (!) працэнтаў. Павялічылася нават колькасць рэзюмэ ад старшакласнікаў, якія спрабуюць працаўладкавацца падчас канікул. Працадаўцы такую тэндэнцыю ацэньваюць станоўча, паколькі моладзь раней пачынае атрымліваць працоўны вопыт. А вось у выкладчыкаў аптымізму менш.

— Я катэгарычна не згодны з тым, што студэнты першага-трэцяга курсаў шукаюць працу, — дзеліцца сваім поглядам **дацэнт факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Мікалай КАЛЬЧЭЎСКІ.** — Паверце, па навучальных планах у іх увесь час распісаны, пачынаючы з аўдыторных заняткаў і заканчваючы самастойнай работай. А калі яны ідуць працаваць, то гэта абавязкова адбіваецца на іх вучобе. У выніку мы выпускаем маладых спецыялістаў, на якасць падрыхтоўкі якіх потым атрымліваем адмоўныя водгукі.

### ПЛАНЫ І РЭЧАІСНАСЦЬ

У сітуацыі, калі частка выпускнікоў можа аказацца незапатрабаванай, узнікае пытанне: чаму б план набору першапачаткова не ўзгадняць з працадаўцамі? Сістэма адукацыі, трэба аддаць належнае, спрабуе так рабіць. Але кампаніі апраўдваюцца: маўляў, прадказаць развіццё сітуацыі на чатыры-пяць гадоў наперад праблематычна.

**З устаноў адукацыі выйдуць маладыя спецыялісты, якія навучаліся і па пяцігадовай праграме вышэйшай школы, і па абноўленай чатырохгадовай. Такім чынам, колькасць выпускнікоў павялічыцца ўдвая.**

— Мы ўжо па гадавых планах жывём, прычым пераглядаем іх кожны квартал. І карэкціроўка на працягу месяца два-тры разы — таксама норма. Эканамічная сітуацыя вельмі хутка змяняецца, — кажа Аляксандр Машко.

**Дырэктар дэпартамента кіравання персаналам «Альфа-Банка» Сяргей ПРЫХОДЗЬКА** лічыць, што больш правільным было бва ўсіх ВНУ даваць студэнтам на працягу першых трох гадоў моцную аснову, а ўжо за год да выпуску, з улікам апошніх тэндэнцый на рынку працы, можна было б запытацца ў кампаній, хто канкрэтна будзе патрэбен, і з улікам гэтага ажыццяўляць спецыялізацыю падрыхтоўкі студэнтаў.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ці змогуць ВНУ сёлета размеркаваць усіх студэнтаў бюджэтнай формы навучання? Гэтае пытанне хвалюе ўсіх...

— Раней практыку размеркавання крытыкавалі, а цяпер расцэньваюць хутчэй як сацыяльную льготу, — адзначае **начальнік упраўлення кадраў БДУ Наталля НЯПЕЎНАЯ.** — Універсітэт праводзіць вялікую працу, каб прадаставіць выпускнікам першае працоўнае месца. Летась забяспечанасць ім у адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю была 98 працэнтаў. Мы разумеем праблему, якая ўзнікне ў 2017 годзе. Безумоўна, будзем рабіць усё магчымае, каб максімальна размеркаваць нашых выпускнікоў. У выпадку, калі хтосьці застанецца без працоўнага месца, заканадаўства дазваляе выдаць свабодны дыплом.

А чаго чакае ад выпускнікоў універсітэтаў бізнес? Як ні дзіўна, фундаментальных ведаў і... умення вучыцца. Бо любая арганізацыя, якая бярэ на працу маладога спецыяліста, рыхтуе яго ў адпаведнасці са сваімі стандартамі і задачамі.

Не менш важны для будучага спецыяліста і камунікатыўны навык.

— Нам, напрыклад, не хапае інжынераў. Праблема не ў тым, што няма спецыялістаў, якія разумеюць механізм вытворчасці. Мала такіх, хто можа камунікаваць з дырэктарамі, абмяркоўваць гандаль і маркетынг, — заўважае **дырэктар па персанале кампаніі «ДанонБел» Айнарс АБЕЛЕ.** — Нам важна, каб чалавек умеў адстойваць сваю думку і разам з тым адчуваў патрэбы, якія ідуць ад бізнесу. Напрыклад, па распрацоўцы новых прадуктаў.

### УВАХОДНЫ КВІТОК

Дадаткова ўскладніць пошук першага працоўнага месца могуць і завышаныя чаканні выпускнікоў.

— Яны вакансіі менш за тысячу долараў нават не хочуць разглядаць! — каментуе **дырэктар кадравага агенцтва «Калекцыя адкрыццяў» Ірына ШАТКОЎСКАЯ.** — Прычым размова ідзе не пра «айцішнікаў», якіх наймальнікі разбіраюць ужо на чацвёртым курсе, а пра іншыя спецыяльнасці. Для маладых людзей больш важна граматна выстройваць сваю кар'еру, а не шукаць самы высокі заробак. Працуй больш, пакажы сябе. У складаныя часы трэба не ныць, а наадварот, праяўляць актыўнасць.

Наймальнікі супакойваюць: вакансіі для выпускнікоў, безумоўна, будуць. Хоць бы таму, што маладыя спецыялісты — больш танная рабочая сіла. Але без жадання працаваць нічога не атрымаецца.

— Чаму наймальнікі не вельмі хочуць браць учарашніх студэнтаў? Таму, што тыя патрабуюць дадатковай увагі, — тлумачыць Сяргей Прыходзька.

— Знайдзіце правільную кампанію, — раіць выпускнікам Айнарс Абеле. — Магчыма, вам не будуць там шмат плаціць, але лічыце, што гэта ваш уваходны квіток у бізнес. Рана ці позна крызіс скончыцца. І на той момант у вас ужо будзе за спінай двух-трохгадовы прафесійны вопыт. І калі ў гэтай кампаніі вам не прапануюць больш высокую пасаду, то вас з задавальненнем возьмуць іншыя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

# СТУДЭНТ, ПРАБЛЕМЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Сёння паказчык забяспечанасці месцамі ў інтэрнатах навучэнцаў устаноў прафтэхадукацыі складае 100 працэнтаў, сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 98 працэнтаў, а студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі — 81 працэнт (па Мінску — 77 працэнтаў). Маюць патрэбу ў засяленні ў інтэрнаты больш як 14 тысяч студэнтаў сталічных ВНУ. А ўсяго па краіне — 20,7 тысячы, — паведаміў на пленуме **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.**

У Гродзенскім універсітэце імя Янкі Купалы, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце і некаторых іншых установах адукацыі сітуацыя застаецца няпростай. Не ўсе студэнты задаволены і ўшчыльненнем інтэрнатаў, на якое адміністрацыя вымушана ісці з дазволу санітарных службаў. Напрыклад, у БНТУ больш за 2,5 тысячы студэнтаў заселены звыш санітарных нормаў.

Каб часткова змякчыць праблему, прафсаюзныя арганізацыі збіраюць і бясплатна прадастаўляюць студэнтам інфармацыю пра адрасы кватэр і пакояў, што здаюцца ўнаём.

Прафсаюзныя лідары ўзнялі перад прадстаўніком Міністэрства адукацыі пытанне аб кампенсацыі за наём жылля іншагароднім навучэнцам. Сёння студэнтаў, якія скарысталіся гэтай магчымасцю, у кожнай ВНУ можна палічыць на пальцах адной рукі. І сума кампенсацыі зусім несур'ёзная (памер яе складае тры базавыя велічыні ў Мінску і дзве базавыя — у іншых населеных пунктах). Да таго ж умовы для яе атрымання цяжкавыканальныя, сярод іх — патрабаванне прад'явіць заключаны з гаспадаром жыллёвай плошчы дагавор, на што апошнія ідуць неахвотна... Вырашыць гэтую праблему можна было б з дапамогай вызвалення ад падаходнага падатку грамадзян, якія здаюць у наём жылыя памяшканні іншагароднім студэнтам і навучэнцам. Хвалюе студэнтаў і перавышэнне тэмпаў росту кошту пражывання ў інтэрнатах над тэмпамі росту памеру іх стыпендый.

Галіновым прафсаюзам прынята рашэнне правесці ў 2016 годзе рэспубліканскі агляд-конкурс на найлепшы студэнцкі інтэрнат, у тым ліку арганізаваць на рэспубліканскім узроўні ўшанаванне лепшых студэнцкіх сем'яў.

## Прафсаюз у сетцы

— Моладзь валодае пазітыўным патэнцыялам, які праяўляецца ў мабільнасці, ініцыятыўнасці, успрымальнасці да інавацыйных змен, здольнасці супрацьстаяць сучасным выклікам. Таму нам неабходна працаваць пад дэвізам: «Арганізацыю павінны бачыць!», — падкрэслівае Аляксандр Бойка.

Прафкамы студэнтаў першымі пачалі актыўную працу ў сацыяльных сетках. Напрыклад, «УКантакце» групы студэнцкіх прафкамаў БДУ, БНТУ, ГДУ імя Скарыны маюць больш за 3,5 тысячы падпісчыкаў. Больш за 2 тысячы падпісчыкаў у групах студэнцкіх прафкамаў Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В. Сухога, Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання.

— Сацыяльныя сеткі ствараюць прамую сувязь паміж студэнтамі, радавымі членамі прафсаюза, і прафсаюзнай арганізацыяй у асобе прафсаюзнага актыву, які займаецца падтрымкай групы. Вось чаму прафактывам важна ўмець аналізаваць развагі, выказванні студэнтаў і ўлічваць гэта ў сваёй працы, а таксама памятаць, што яркія, арыгінальныя і масавыя фотаздымкі раскажуць пра мерапрыемства лепш за любы тэкст, — упэўнены Аляксандр Бойка.

**Члены прафсаюза — уладальнікі дысконтных картак — могуць карыстацца зніжкамі пры набыцці адзення, наведванні курсаў замежных моў, школы танцаў, стаматалагічных цэнтраў, студыі загару, пейнтбольнага клуба, клуба ёгі, пры падключэнні інтэрнэту і гэтак далей.**

Станоўчым пачынаннем — стварэннем студэнцкай інтэрнэт-газеты «Студэнты і прафсаюз — разам» адзначаны пачатак 2016 года. Размова ідзе пра інфармацыйны партал студэнцкіх прафсаюзных спраў. Старшыня ЦК папярэдзіў: «Не варта забываць, што сайт — вельмі каштоўная інфармацыйная пляцоўка. Гэта дзейсны механізм пазіцыянавання арганізацыі, яе афіцыйнае прадстаўніцтва, значны элемент у фарміраванні іміджу. Статычны, неактуальны сайт, які не абнаўляецца, не дапушчальны для маладзёжнай аўдыторыі і наогул для прафсаюзнай арганізацыі».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У Студэнцкай вёсцы ўмовы пражывання — па найвышэйшым разрадзе...

## Дысконт як стымул

**Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, член Савета Федэрацыі прафсаюзаў Віктар АЎДЗЮШКА** таксама лічыць інфармацыйную працу найважнейшым напрамкам дзейнасці прафкама. У 2013 годзе ва ўніверсітэце пачаў функцыянаваць студэнцкі інфармацыйны прафцэнтр «ПРОФІ».

На сённяшні дзень яго дзейнасць уключае 3 асноўныя напрамкі работы, 2 інфармацыйныя інтэрнэт-парталы, больш за 100 відаў графічных работ і паліграфіі, больш за 25 відаў відэаматэрыялаў сацыяльнай, прафарыентацыйнай, рэкламнай і інфармацыйнай накіраванасці, два ўнутрыўніверсітэцкія СМІ «Вір падзей», «Профі» і г.д.

— Пры падтрымцы абласнога камітэта прафсаюза мы рэалізоўваем многія маладзёжныя праекты і студэнцкія ініцыятывы, — расказаў Віктар Аўдзюшка. — Адна з іх — гэта праграма сацыяльнай лаяльнасці «Залаты білет», дзякуючы якой уведзены льготы для студэнтаў горада і вобласці (членаў прафсаюза) у выглядзе сістэмы зніжак пры наведванні фізкультурна-аздараўленчых цэнтраў, культурна-забаўляльных устаноў. Падобная праграма рэалізуецца ў прафсаюзнай арганізацыі ўніверсітэта харчавання з 2013 года і прыносіць адчувальны вынік. У 2015 годзе на 27 працэнтаў павялічылася наведванне студэнцкай моладдзю фізкультурна-аздараўленчых устаноў, басейнаў і лядовых палацаў.

Падобная дысконтная праграма дзейнічае і ў БНТУ. Члены прафсаюза — уладальнікі дысконтных картак — могуць карыстацца зніжкамі пры набыцці адзення, наведванні курсаў замежных моў, школы танцаў, стаматалагічных цэнтраў, студыі загару, пейнтбольнага клуба, клуба ёгі, пры падключэнні інтэрнэту і гэтак далей. Выраб дысконтнай карткі ажыццяўляецца за кошт сродкаў партнёраў праграмы, таму студэнтам плаціць за картку не трэба. У гэтым навучальным годзе прафсаюзнай дысконтнай праграмай карыстаюцца ў БНТУ больш як 3 тысячы чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by




## ЮНКАРЫ, УВАГА!

**З сённяшняга выпуску «Чырвонка. Чырвоная змена» пачынае друкаваць найлепшыя «пробы пяра» нашых юных і маладых няштатных аўтараў, што паступілі на творчы конкурс. Нагадаем, што падвесці яго вынікі традыцыйна плануецца да пачатку сёлетняй уступнай кампаніі, каб пераможцы творчага спаборніцтва паспелі атрымаць, акрамя памятных падарункаў, рэкамендацыі для паступлення на журфак. І хоць да той даты яшчэ дастаткова часу, раім нашым аўтарам не зацягваць з адпраўленнем сваіх «проб пяра». Тыя, хто хоча далучыцца да ўдзелу ў конкурсе, могуць азнаёміцца з правіламі яго правядзення ў нумарах «Чырвонкі. Чырвонай змены» ад 10 верасня і 5 лістапада 2015 года або на сайце «Звязды». Выпрабуйце свае творчыя сілы! Абяцаем: прайграўшых не будзе!**

# ПЕСНІ — НАЙЛЕПШЫЯ ЛЕКІ АД СУМУ

**...Нарэшце ўсе выпрабаванні скончыліся. Я паставіла апошнюю кропку і адклала ручку. Алімпіядныя заданні аказаліся даволі складанымі. Цікава, якім будзе вынік?.. Кідаю погляд на суседнюю парту: на твары маёй аднакласніцы Дашы Капцюг упэўненасць і спакой. І нядзіўна! Пазалетась яна заняла чацвёртае месца ў абласной алімпіядзе па замежнай мове, ледзь не трапіла ў тройку лідараў. Аднак Дар'я не шкадуе: «Галоўнае, што я магу чытаць кнігі і глядзець фільмы на нямецкай мове і амаль заўсёды разумею іх змест». Але я хачу расказаць пра сваю аднакласніцу не як пра выдатніцу і актывістку, а як пра дзяўчыну з глыбокім унутраным светам.**

У шостым класе Даша запісалася ў клуб аўтарскай песні нашай гімназіі. З таго часу стала пісаць вершы і складаць музыку: «Мяне можа натхніць усё што заўгодна: чалавек, фільм ці песня, якая мне вельмі спадабаецца. Часам уражвае прырода, асабліва неба».

Але часцей за ўсё брацца за ручку дзяўчыну прымушаюць моцныя пачуцці, якія яна выказвае на паперы. Таму большасць з трыццаці песень юнай кампазітаркі — пра каханне. Ці ёсць сярод іх улюбёная? Так, і гэта заўсёды апошняя. «Але з цягам часу яна пачынае надакучаць, і тады хочацца напісаць штосьці новае».

Па словах Дашы, галоўная прыхільніца яе творчасці — кіраўнік клуба аўтарскай песні Наталля Антонаўна Паўлюшчык. «Нам з ёй вельмі пашанцавала. Яна жыццярадасная і добрая. Увесь час нас падтрымлівае», — кажа вучаніца пра свайго педагога.

Дар'я амаль ніколі не растаецца з любімай гітарай. Выконвае свае песні на школьных канцэртах і проста так, у калідорах гімназіі. З ёй у дуэце спявае не найлепшая сяброўка Дзіяна. Пазалетась дзяўчынкі перамаглі ў раённым конкурсе аўтарскай песні «Спяваем разам з сябрамі». Але поспех усміхаецца не заўсёды: «Звычайна на розных праслухоўваннях сядзяць сталыя людзі, якія не прымаюць нашу музыку. Ім патрэбны дзяўчынкі на абцасах, у доўгіх сукенках, якія спяваюць пра нешта ўзнёслае. А мы звычайна прыходзім у джынсах і красоўках, і нам кажуць: «Малайчыны, але вы нам не падыходзіце».

Аднак дзяўчына не жадае адпавядаць шаблонам: «Я ні на кога не хачу быць падобнай. Таму што такі чалавек ужо ёсць. Лепш быць асобай і індывідуальнасцю».

Для Дашы самае важнае ў жыцці — гэта сям'я, сябры і музыка: «Галоўнае, каб блізкія людзі былі побач, і тады ўсё будзе добра». Прытрымліваецца прынцыпу, што «да ўсяго трэба ставіцца з усмешкай, не ўспрымаць няўдачы сур'ёзна і захоўваць у памяці толькі яркія моманты».

Але цяжкія хвіліны ўсё ж здараюцца, і тады Даша звяртаецца па параду да мамы і найлепшай сяброўкі. Пісаць песні — таксама добры сродак ад суму. «Гэтак жа, як і кнігі, музыка дазваляе забыцца аб праблемах, ствараць сваю рэальнасць, — кажа дзяўчына. — Часам сэнс песень супадае з перажываннямі слухачоў. І я рада, калі мая творчасць дапамагае іншым разабрацца ў сабе».

**Дар'я СВІРЫДА, вучаніца 11 класа гімназіі №10 г. Маладзечна.**


Дзіяна і Дар'я *(справа)* на конкурсе аўтарскай песні.

**Пра аўтара**

**— Сёлета я заканчваю школу і свой далейшы лёс планую звязаць з журналістыкай. Яшчэ ў дзяцінстве мне падабалася складаць казкі, апавяданні і вершы. А пасталеўшы, я зацікавілася журналісцкімі жанрамі, — кажа 17 гадовая аўтарка. — Таксама я пішу песні і выконваю іх. Люблю праводзіць вольны час на прыродзе разам з сябрамі.**

**Дар'я не ў першы раз бярэ ўдзел у нашым творчым конкурсе для маладых і юных няштатных аўтараў. «Вось і летась я дасылала «пробу пяра» на конкурс «Я — малады. І мне не ўсё роўна!..» Рада, што гэтая тэма загучала зноў, бо мне ёсць яшчэ што сказаць» — запэўнівае дзяўчына.**

# У МЯНЕ ЎСЁ АТРЫМАЕЦЦА!

**Шалёна стукае сэрца... Мяне перапаўняюць эмоцыі, мне страшна. Таму, што я раблю гэта першы раз? Баюся, што не атрымаецца? Не! Не страшна! Усё выдатна, я не павінна палохацца! Трэба перамагчы сябе і ісці да сваёй будучыні. Я выбрала гэты шлях, значыць, павінна рухацца да мэты, да таго, што зробіць мяне шчаслівай. Ведаю, што ўсё пройдзе незабыўна, і я заўсёды буду памятаць гэты дзень. Усё! Час прыйшоў. Праз некалькі хвілін здарыцца тое, чаго я так доўга чакала: буду выступаць у прамым тэлеэфіры. Гэта выдатна! Як жа я рада!**

...Мяне клічуць. Павольна саджуся ў крэсла; глыбока ўздыхнуўшы, лічу секунды. Запалілася святло, камера глядзіць на мяне, наступіла цішыня. На маіх вуснах з'явілася радасная ўсмешка, вочы ярка заззялі. Яшчэ раз глыбока набраўшы паветра, я пачала гаварыць! І ў гэты ж самы момант адчула сябе моцнай, свабоднай! Усё ідзе так, як і хацела: жыва, лёгка — і гэта радуе. Мне падабаецца, што я раблю, як я паводжу сябе перад камерай. Бачу шмат людзей і назіраю, як яны глядзяць на мяне і ўважліва слухаюць. Я рада, што магу быць карысней ім, бо дапамагаю даведацца нешта новае.

Але вось і скончылася маё выступленне. Можна з радасцю выдыхнуць і сказаць, што я справілася. Да мяне падыходзяць тэлеапаратары, хваляць, віншуюць з першым выхадам у эфір. Не магу стрымаць усмешкі шчасця на вуснах! Я вельмі ўдзячная ўсім, хто дапамог мне прайсці гэты доўгі шлях. Цяпер магу адчуваць сябе ўпэўненай у тым, што раблю, што думаю. Самае галоўнае — гэта тое, што я навучылася наладжваць нябачную сувязь з людзьмі на такой велізарнай адлегласці, завалодаўшы іх увагай. І зараз магу сказаць, што я шчаслівы чалавек, які ішоў да мэты і дамогся свайго.

...Я расплюшчваю вочы. Як жа цікава паспрабаваць зазірнуць у будучыню, якая часам здаецца нам бясконца далёкай і ў той жа час вельмі блізкай!.. І менавіта такой бачу ў ёй сябе: шчаслівым чалавекам, які дабіўся таго, чаго хацеў і чакаў. Я мару стаць журналістам, які будзе пазнаваць свет, размаўляць з тысячамі людзей, абменьвацца з імі сваімі ідэямі, думкамі. Мне падабаецца гэта прафесія, таму што яна асаблівая. І людзі, што працуюць у ёй, — таксама. Я хачу быць такой жа неардынарнай, індывідуальнай, мару паказаць сябе чалавекам, у якога ёсць іскрынка, які можа зацікавіць многіх іншых. Таму і мару, што ў мяне ўсё атрымаецца!

**Ганна КУРТАСАВА, вучаніца 11 класа ліцэя №2 г. Мінска.**

**Пра аўтара**

**Дзяўчына з самага маленства марыла быць творчым чалавекам. «Мне заўсёды падабаецца браць удзел у школьных канцэртах і конкурсах». Ганна займалася спартыўнымі бальнымі танцамі, на раённых спаборніцтвах займала прызавыя месцы. Потым захапілася напісаннем казак і невялікіх апавяданняў. Пасля дзявятага класа паступіла на філалагічны кірунак ліцэя, каб паглыблена вывучаць рускую і англійскую мовы.**

**17-гадовая аўтарка збіраецца паступаць на журфак БДУ. «І я вельмі спадзяюся, што мая мара ажыццявіцца».**

# «ПАДАБАЕЦЦА ДАПАМАГАЦЬ ІНШЫМ»

**Праект «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту», скіраваны на навучанне пажылых людзей, дзейнічае з 2013 года. За гэты час дзякуючы яму па розных праграмах адвучыліся больш за дзве тысячы пенсіянераў. Пажылыя людзі вывучаюць замежныя мовы, асвойваюць фотасправу і ландшафтны дызайн, журналістыку і псіхалогію, краязнаўства, займаюцца лячэбнай гімнастыкай. Сёлета ўніверсітэт прапанаваў навучанне па 19 напрамках. Гэта стала магчымым дзякуючы валанцёрам-выкладчыкам. У ролі настаўнікаў выступаюць самі пенсіянеры, працуючыя спецыялісты, а таксама студэнты. З адным з іх я сустрэлася і нават пабывала ў яго на занятках. Гэта Мікіта Хазаў, вельмі актыўны малады чалавек. Яму 21 год, вучыцца хлопец на завочным аддзяленні Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта.**

***— Што цябе падштурхнула да валанцёрскай дзейнасці?***

— Я добраахвотна дапамагаў людзям яшчэ да таго, як прыйсці сюды. Зімой мінулага года, калі ў мяне была сесія, выпадкова ўбачыў аб'яву, з якой вынікала, што існуе такі праект і патрабуюцца валанцёры для працы выкладчыкамі. Мне прапанавалі весці курсы камп'ютарнай асветы. А паколькі я разбіраюся ў гэтай справе, стала цікава паспрабаваць сябе ў ролі выкладчыка, навучаць іншых, захацелася набыць пэўны вопыт. Паспрабаваў, і ў мяне атрымалася.


Сярод захапленняў Мікіты скалалажанне...


...і скачкі з вышыні.

***— Ці патрабуецца спецыяльная падрыхтоўка, каб працаваць выкладчыкам?***

— Сёлета пры ўніверсітэце адкрыўся цэнтр валанцёраў, дзе кожны можа прайсці навучанне і атрымаць дапамогу ў рэалізацыі ўласнай ініцыятывы.

***— Як удаецца сумяшчаць вучобу і пастаянную працу з валанцёрствам?***

— Я вучуся на завочным аддзяленні. І калі рацыянальна размеркаваць свой час, то яго хапае і на напісанне кантрольных работ, і на падрыхтоўку да экзаменаў, і на валанцёрскую дзейнасць, а таксама на такія любімыя заняткі, як парашутныя скачкі летам і скалалажанне ўзімку. Працую я на скаладроме, а раней — у краме камп'ютарнай тэхнікі. Да таго ж я малады, а маладым усё пад сілу!

***— Ёсць цяжкасці ў наладжванні стасункаў з пажылымі людзьмі? Усё ж вялікая розніца ва ўзросце...***

— Пакуль ніякіх праблем не было. У прынцыпе, пры жаданні з любым чалавекам можна знайсці агульную мову. Людзі пажылога ўзросту — не выключэнне. Асабіста са мной яны даволі лёгка ідуць на кантакт. Відавочныя цяжкасці ў іншым: не ўсе навучэнцы лёгка засвойваюць матэрыял. Стараюся тлумачыць, паўтараць па некалькі разоў.

***— Цікава было б падрабязней даведацца аб тваёй выкладчыцкай працы.***

— Заняткі праводжу ў адпаведнасці з планам, які ўключае такія раздзелы, як базавае карыстанне ПК, карыстанне інтэрнэтам, сацыяльнымі сеткамі, поштай. Можам навучыць пажылых людзей аплачваць камунальныя паслугі або тэлефон праз інтэрнэт. Курсы карыстання тэхнікай Apple праводзіцца толькі другі раз, таму спецыяльнай праграмы няма, я склаў для сябе прыкладны план, па якім і працую.

***— Увогуле, валанцёрства для цябе — гэта...***

— ...Усведамленне таго, што робію добрыя справы. Я даволі камунікабельны чалавек, і мне падабаецца сам працэс стасункаў з людзьмі. А яшчэ прыемна, што слухачы ўдзячны табе і цэняць інфармацыю, якую даеш ім. Акрамя праекта «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту», планую яшчэ дапамагаць у фондзе «Шанц» і ў грамадскай арганізацыі «Разуменне».

На мой погляд, жыццё — гэта пастаянны пошук сябе. Праца павінна прыносіць не толькі матэрыяльнае забеспячэнне, але і маральнае задавальненне.

**Настасся ГАРОСТ, вучаніца 10 класа Ліцэя БДУ.**

**Пра аўтара**

**— Я вельмі люблю тварыць: маляваць, плесці кошыкі, пісаць, — расказвае пра сябе 16-гадовая аўтарка. — У вольны ад вучобы час спрабую здымаць кароткаметражкі і рабіць сваю агучку мультфільмаў. Мне не падабаецца звычайнасць і манатоннасць. Аддаю перавагу жывым стасункам.**

**Больш за ўсё дзяўчына не пераносіць несправядлівасць. Любіць дапамагаць людзям, марыць змяніць свет да лепшага. Таксама ёй падабаецца назіраць за людзьмі і асэнсоўваць іх учынкі. Настасся не выключае, што ў будучым можа звязаць свой далейшы лёс з прафесіяй журналіста.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
4 02 2016 г.

*Ёсць ідэя!*

# «УЗОРНЫЯ» ВУЧНІ

## Праект, які з'явіўся з шапкі і заплечніка

**Папулярнасць беларускага арнаменту цяпер не паддаецца сумненню. У навучэнца Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа швейнай вытворчасці Дзяніса НАЛІЎКІ з'явілася ідэя — надаць «вышыванкам» афіцыйны статус школьнай формы. 25-гадовы хлопец нават стварыў адмысловыя камплекты адзення і аксесуараў і прадставіў іх на конкурсе «100 ідэй для Беларусі». Мадэлі формы пад агульнай назвай «Крок у будучыню» ўжо перамаглі на абласной выставе-прэзентацыі, наперадзе — рэспубліканскі ўзровень.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Насамрэч, я раней ніколі не думаў, што буду займацца адзеннем, — прызнаецца Дзяніс. — Пасля школы, як і ўсе аднакласнікі, паступіў ва ўніверсітэт. Выбраў філалагічны факультэт БДУ, спецыяльнасць «руская філалогія». Але праз два гады зразумеў, што гэта зусім не маё. Добра, што своечасова апамятаўся. У аднагрупніцы сястра працавала дызайнерам, мяне гэта натхніла, і я сам паспрабаваў нешта намаляваць. У выніку вырашыў паступіць у каледж і не шкадую. Сёлета атрымаю спецыяльнасць «мадэльер-канструктар».

Адна з галоўных пераваг працы, паводле слоў Дзяніса, — магчымасць самому «зарабляць на хлеб» нават падчас вучобы. Хлопец стварае адзенне на замову, распрацоўвае калекцыі пад уласным брэндам і пры гэтым паспявае займаць высокія месцы на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

Ідэя школьнай формы нарадзілася з калекцыі пад назвай «Рака жыцця», якую Дзяніс распрацоўваў раней. Гэта было маладзёжнае адзенне ў стылі спорт-шык з элементамі беларускага арнаменту. Аднак для завяршэнасці калекцыі не хапала некаторых дэталяў — заплечніка і шапкі. Падчас працы над аксесуарамі і з'явілася ідэя выпусціць іх асобным наборам для старэйшых школьнікаў.

— Тады я і прапанаваў адміністрацыі каледжа зрабіць эскізы цэлай школьнай калекцыі, — узгадвае хлопец. — І проста «для фону» накідаў варыянты не толькі з аксесуарамі, але і з паўнавартаснай формай. У адказ пачуў: «Мы ж швейнікі, таму будзем рабіць і тое, і тое». Вось так, з шапкі і заплечніка і нарадзіўся праект.



Трэба сказаць, што форма, распрацаваная Дзянісам, моцна адрозніваецца ад адзення з арнаментам, якое цяпер прадаюць у шматлікіх крамах. У калекцыі выкарыстоўваюцца не цэлыя ўзоры, як на традыцыйных беларускіх строях, а толькі іх элементы. Такая своеасаблівая аўтарская інтэрпрэтацыя робіць форму непаўторнай і адначасова вельмі сучаснай — залішняга падабенства з сялянскім адзеннем у яе няма.

— Зараз увогуле вельмі папулярны трэнд — пікселізацыя, павелічэнне дробных дэталяў да буйных маштабаў, у якіх яны становяцца непазнавальнымі, — кажа стваральнік калекцыі. — Здагадацца, што на адзенні арнамент, можна толькі здалёк. Скажу шчыра, я не ставіў галоўнай задачай перадаць гэтымі дэталямі той глыбокі сэнс, які нясе арнамент. Гэта, хутчэй, проста стылізацыя, заснаваная на нацыянальных матывах. Але, вядома, мы праглядалі значэнні, каб на форму не трапілі неадпаведныя элементы.

Калекцыя складаецца з хлапечага і дзявочага камплектаў для малодшай школы, а таксама аксесуараў для старэйшых школьнікаў — тых самых шапак і заплечнікаў. На думку стваральніка, апошнія наўрад ці будуць у захапленні ад перспектывы апранацца аднолькава. Калі праект прымуць да рэалізацыі, Дзяніс бачыць сэнс у стварэнні асобных калекцый для розных школ — гэта дазволіла б вучням нават знешне ідэнтыфікаваць сябе з уласнымі навучальнымі ўстановамі.

— Думаю, што наша калекцыя прыйдзецца ім даспадобы, — кажа хлопец. — Але галоўная задача нават не ў гэтым. Мне хочацца паказаць, што нам ёсць чым ганарыцца ў сваім мінулым, ёсць адкуль чэрпаць новыя ідэі. У Беларусі выдатныя традыцыі, і я мару аб тым, каб у будучых пакаленняў з дзяцінства выхоўвалася любоў да роднага. У гэтым галоўны пасыл. Магчыма, конкурс «100 ідэй для Беларусі» дапаможа задуме спраўдзіцца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Справы маладых*

# ТЭХНАЛОГІІ З ПРАБІРКІ,

## або Як біёлагі змяняюць нашу будучыню



**Як думаеце, за які час можна вырасціць, скажам, растаропшу? Садаводы ці агароднікі са стажам пацвердзяць: гэтае пустазелле поўнасцю фарміруецца за тры-чатыры месяцы... Але пры дапамозе сучасных тэхналогій дарослая расліна можа з'явіцца значна хутчэй — за два тыдні. Праўда, сонца і дажджу такі арганізм так і не «ўбачыць» — разам з дзясяткамі «прыяцеляў» куст будзе расці ў спецыяльнай шклянцы, напоўненай пажыўным рэчывам. Такі спосаб называецца мікракланальным размнажэннем. Больш падрабязна пра яго, а таксама пра сваю любоў да працы і ўласныя поспехі «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказала малодшы навуковы супрацоўнік аддзела біяхіміі і біятэхналогіі раслін Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук Вольга КАЎЗУНОВА, якая нядаўна атрымала стыпендыю Прэзідэнта краіны.**

— Гэта адбылося за даследаванні плямістай растаропшы, — гаворыць дзяўчына. — Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя за 2015 год, захворванні печані знаходзяцца на дзявятым месцы сярод прычын смяротнасці. Таму ў Беларусі і за мяжой прафілактыка і лячэнне захворванняў гэтага органа застаюцца сур'ёзнай праблемай. Адным з ключавых момантаў з'яўляецца распрацоўка новых біялагічна актыўных фармакалагічных прэпаратаў на аснове раслінная сыравіны. Галоўнае біялагічна актыўнае злучэнне растаропшы — сілімарынавы комплекс — не прысутнічае больш ні ў адной расліне.

Гэты комплекс абараняе печань ад вялікага спектра ўздзеянняў: хімічнага, цяжкіх металаў, радыяцыі, бактэрый, вірусаў. Фактычна, сілімарын выконвае ролю «брані» для найважнейшага органа. Серыя эксперыментаў паказала, што пасля ўвядзення ў крываток мышы гэтага рэчыва і наступнага атручвання, напрыклад ядам белай паганкі, гіне толькі каля 23 працэнтаў клетак печані, але арганізм застаецца жывым. Без такой абароны пашкоджанне атрымліваюць амаль 100 працэнтаў клетак — несумяшчальны з жыццём паказчык.

Растаропшай Вольга займаецца ўжо чатыры гады. Да працы яе падштурхнуў навуковы кіраўнік, акадэмік Уладзімір Рашэтнікаў, які заўважыў, што ў Беларусі мала ўвагі надаецца раслінам, якія дапамагаюць у лячэнні захворванняў печані. Вольга працуе з двума сартамі: венгерскім і «Папялушкай», выведзеным у батанічным садзе. На жаль, у Беларусі няшмат вольных пасяўных плошчаў, тым больш для засявання растаропшай — раслінай, вядомай беларусам як пустазелле. Вырашыць праблему дапамагаюць біятэхналогіі — кожныя 14 дзён у батанічным садзе збіраюць «ураджай» вырашчанай у шклянках абароны печані.

Галоўнае дасягненне Вольгі заключаецца ў выяўленні ўмоў, пры якіх растаропша «з прабіркі» назапашвае найбольшую колькасць карысных рэчываў. Пры дапамозе хімічнай апрацоўкі (спосаб, распрацаваны ў Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі НАН, — расліну «кормяць» наначасціцамі жалеза, медзі, кобальту, якія не аказваюць таксічнага ўздзеяння. — **Аўт.**) атрымалася павялічыць назапашванне растаропшай рэчываў другаснага метабалізму ў два-чатыры разы. Яшчэ адзін метад — электрамагнітнае ўздзеянне. На спецыяльнай устаноўцы ў Інстытуце ядзерных праблем БДУ звычайна апрацоўваюць насенне для таго, каб павялічыць яго ўсходжасць.

Сама Вольга родам з Рэчыцы, а ў Цэнтральны батанічны сад трапіла падчас навучання ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка.

— На радзіме ў маіх бацькоў свой дом, вядома, з участкам, на якім маці вырошчвае разнастайныя кветкі, — дзеліцца дзяўчына. — Яна расказвала, што гады ў тры я ўвесь час корпалася ў зямлі, выкопвала дажджавых чарвякоў, спрабавала іх дзяліць. Таму, скажам так, цікавасць да біялогіі была заўсёды. Паралельна любіла гуляць «у настаўніцу». У школьныя гады мне здавалася, што гэтая праца не надта складаная. Але на практыцы, калі на старшых курсах давялося папрацаваць у гімназіях, школах, ліцэях, зразумела, як бывае цяжка. Цяпер я таксама ў пэўнай ступені займаюся педагагічнай дзейнасцю, бо да нас прыходзяць студэнты-практыканты з таго ж БДПУ, і мы дапамагаем ім у напісанні навуковых прац.

Дзяўчына вучылася на факультэце прыродазнаўства па спецыяльнасці «Біялогія і хімія». З трэцяга курса пачала пісаць курсавыя і дыпломныя работы пры Цэнтральным батанічным садзе, бо для выканання ёй патрэбны былі эксперыменты, якія можна правесці толькі тут.

— Адразу я прыйшла ў лабараторыю экалагічнай фізіялогіі, — распавядае навукоўца. — Там займалася праблемай падбору хвойных дрэў для азелянення Мінска. Трэба было знайсці такія віды, якія будуць адпавядаць прыродным патрабаванням тэрыторыі сталіцы. Таполі і клёны ў Мінску жаўцеюць, каштаны таксама дрэнна сябе адчуваюць. Вось мы і шукалі дрэвы, якія вытрымаюць салявыя нагрузкі, не памруць ад высокай колькасці цяжкіх металаў і адначасова будуць ачышчаць паветра. Асабіста я займалася піхтамі. У выніку знайшлі такі сорт, якім у сталіцы цяпер і карыстаюцца.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пасля была магістратура пры БДПУ, а ў аспірантуру Вольга паступіла, ужо працуючы ў батанічным садзе. Тады ж пачалася праца па вывучэнні растаропшы. Галоўнае, аб чым дзяўчына шкадуе — у Беларусі вынікі працы пакуль не запатрабаваны. Айчынныя фармацэўтычныя кампаніі працягваюць набываць сыравіну за мяжой, і іх можна зразумець. Для таго, каб наладзіць біятэхналагічную вытворчасць у нас, патрабуюцца велізарныя грашовыя сродкі. І рабіць гэта дзеля адных толькі прэпаратаў для абароны печані немэтазгодна. З іншага боку, хворым на гепатыт С сур'ёзна дапамагло б стварэнне беларускага аналага шалёна дарагіх замежных прэпаратаў для абароны печані.

Акрамя працы ў Цэнтральным батанічным садзе, Вольга разам з мужам з мінулага года займаецца стварэннем сайта для зацікаўленых біятэхналогіямі людзей. Biofact.by распавядае пра мікракланальнае размнажэнне, фармацэўтыку, біяхімію, фізіялогію, публікуе матэрыялы для студэнтаў і школьнікаў. Там жа публікуюцца вынікі працы Вольгі і яе калег. За год рэсурс сабраў пэўную аўдыторыю і ўжо прыносіць стваральнікам карысць — менавіта праз яго на беларускіх біятэхналагаў выходзяць замежныя калегі з прапановамі аб супрацоўніцтве.

— Я тут на сваім месцы, — падсумоўвае Вольга. — Нягледзячы на пэўныя праблемы, адчуваю, што працую не ўпустую: калі калегі з розных краін цікавяцца вынікамі работы, калі іншыя ўстановы і фармацэўтычныя кампаніі прапануюць супрацоўніцтва... Я разумею, што ўся мая праца можа стаць маленькім крокам дзеля вырашэння вялікіх праблем і ўратавання чалавечых жыццяў, і гэта галоўнае.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
4 02 2016 г.



*Рэльеф пачуццяў*

# ЖЫВАПІС... НА ВАСТРЫІ НАЖА

**Леанід Афрэмаў — сучасны мастак-імпрэсіяніст, што нарадзіўся ў Беларусі, але цяпер жыве і працуе ў Мексіцы. Калі спыніць на вуліцы мінака і запытаць, ці знаёмае яму гэтае прозвішча, хутчэй за ўсё адказам будзе кароткае «не». Між іншым, многія з нас бачылі яго карціны.**

Не пазнаць беларускага імпрэсіяніста цяжка. Тэхніка малюнка Афрэмава — з'ява выключная, бо замест звыклага пэндзля ён выкарыстоўвае... нож. Зразумела, не звычайны кухонны, а мастыхін — ім здымаюць з палатна лішкі фарбы, ствараюць рэльеф. Маляваць з яго дапамогай раней не спрабавалі, ідзя зусім наватарская. Галоўнае — такі падыход да жывапісу дзейнічае, бо малюнкі атрымліваюцца сапраўды жывыя і насычаныя. Людзям яны падабаюцца: у Леаніда Афрэмава мноства карцін, якія знаходзяцца прыкладна ў 60 студыях і галерэях па ўсім свеце.

Яго жыццё часткова нагадвае біяграфію Марка Шагала: абодва нарадзіліся ў Віцебску ў яўрэйскіх сем'ях і шмат падарожнічалі. Але вуліцы роднага горада і выявы жыццярадаснага Парыжа на іх палотнах маюць шмат стылёвых адрозненняў. Нягледзячы на тое, што Афрэмаў скончыў Віцебскую мастацкую школу, заснаваную Шагалам, уплыў апошняга не вызначыў яго жывапісную манеру. Эксперыменты пачаліся пасля пераезду ў Ізраіль. Мясцовы каларыт адпавядае настрою мастака, і ён замяняе пэндзаль на мастыхін, каб «наносіць» алейныя фарбы буйнымі, выразнымі мазкамі. Колеры на яго палотнах нібыта насычаны сонечным святлом і цеплынёй. Але падтрымкі ад мясцовых жыхароў не было. Артадаксальныя яўрэі імкнуліся навязаць сваё кананічнае бачанне мастацтва, і першую выставу Леаніда знішчылі. І вось шэраг новых пераездаў, спачатку ў ЗША, а потым у Мексіку, дзе творца пасяліўся на сваім ранча.

Змены ў матэрыяльным і творчым становішчы пачаліся, калі сын мастака даведаўся пра сайт eBay і прапанаваў выставіць на ім некалькі малюнкаў. Гандаль праз інтэрнэт пайшоў добра, і карціны хутка пачалі раскупляць. Самы важны вынік такога кроку — гэта свабода самавыяўлення, якую нарэшце набыў Леанід. Стасункі з аўдыторыяй наладзіліся наўпрост, больш не трэба было звяртацца па дапамогу да галерэй і дылераў, шукаць падтрымкі ў тых, хто патрабue падладжвацца пад чужы густ. І пачалася сапраўдная неабмежаваная творчасць. «Мне падабаецца адлюстроўваць прыгажосць, гармонію і дух гэтага свету ў сваіх карцінах», — кажа Леанід Афрэмаў у адным з інтэрв'ю. Жывапіс яго не скіраваны на тое, каб данесці схаванае паведамленне ці выказаць палітычную ідэю. Адзіная мэта імпрэсіяністычнага мастацтва — выказаць уражанне, што стварылася пасля хуткага позірку на рэчы, перадаць настрой, а не расказаць цэлую гісторыю.

Таму творы яго дыхаюць і імчацца некуды, вірують, зіхацяць сакавітымі фарбамі, клічуць за сабой у падарожжа па цудоўным і невераемным свеце. Яны — жыццё, застылае на адно імгненне, але поўнае руху, паветра, свежасці і прыгажосці. Заўсёды радасныя, працятыя аптымізмам карціны Афрэмава, заснаваныя на ўласных успамінах і эмоцыях мастака, здаюцца зразумелымі і блізкімі ўсім людзям. Іх з ахвотай набываюць у розных краінах, каб атрымаць частку той святочнасці і ўзрушанасці, якую так прыемна адчуць кожнаму з нас.



**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Сонца пад вокладкай*

# БЕЗ ЛІНІІ ГАРЫЗОНТУ,

## або У майстэрні мастака дзіцячай кнігі

**Маленькі пакойчык нагадвае пячору з цудамі: у шафе кнігі, з паліцы выглядвае гіпсавая галава, а спакуса памацаць садавіну ў невялічкім кошыку (сапраўдная ці не?) становіцца неадольнай. Сярод усяго гэтага — лінейкі, стос папер з табліцамі і павелічальнае шкло. Для кніжнага графіка яны такія ж важныя, як алоўак і фарбы.**

— Для мяне кожная новая кніга пачынаецца з таго, што выдавецтва задае фармат і агаворвае пэўную колькасць ілюстрацый, — **мастак кніг і адначасова выкладчыца Гімназіі-каледжа мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка Галіна ХІНКА-ЯНУШКЕВІЧ** расказвае, як з'яўляюцца дзіцячыя «чытанкі-маляванкі». — Я перачытваю тэкст, раблю пазнакі, дзе і якую ілюстрацыю трэба паставіць. Потым на аркушы чарку будучы памер малюнка, своеасаблівую «рамку».

***— Вашай рукой зроблены ілюстрацыі больш чым да сотні кніжак...***

— Каб не засумаваць і не страціць нейкую вастрыню, стараюся кожную аздабляць у новай тэхніцы. Часцей за ўсё працую з дзіцячымі вершамі, але, здараецца, трапляе і дарослая паэзія. Бывае і проза. Стараюся адчуць кожны твор, тады аўтар сам падштурхне сваім стылем да пэўных эксперыментаў, ад гэтага і будзе залежаць выгляд кніг пасля выхаду з друку. А яшчэ, вядома, уплываюць пажаданні выдавецтва і саміх пісьменнікаў, паэтаў.

***— Як пад адной вокладкай ужываюцца мастак і аўтар тэксту?***

— Мастак прыдумляе (і часта!) тое, пра што ў вершы не было сказана. Вядома, трэба маляваць па сюжэце, але заўсёды хочацца дадаць сваё. Атрымліваецца, што паэт і мастак уступаюць у сутворчасць. Напрыклад, на літару «П» у чытанцы для дзяцей аўтар прапануе словы «пяро». А ёсць жа яшчэ і «пень», «пэндзаль», «пчолы». Чаму б не падштурхнуць дзіцячую свядомасць, не намаляваць чалавечка ў паласатым Пчаліным світары, з Пэндзлем у руках, які стаіць побач з Пнём, а недзе побач лётаюць яшчэ і Птушкі? Атрымліваецца такі вельмі прыдатны да разваг ланцужок, які дзіця можа прадоўжыць.

***— Як яшчэ можна спалучаць карысное і прыгожае?***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Можна зрабіць «камп'ютарную» паперу з палосачкамі ці ромбікамі, а потым выразаць патрэбную форму, наклеіць і дамаляваць астатняе акварэллю. Нашы дзеці жывуць ужо ў крышачку іншым свеце, звычайны малюнак алоўкам ім будзе не такі цікавы. Калі вакол электроніка, кліпы, рэклама, трэба падладжвацца пад дзіцячы свет. Безумоўна, можна намаляваць ablokі, як з фотаздымка. Дзіця паглядзіць, магчыма, скажа: «Гэта прыгожа». А вось калі гэтыя аблокі маюць камп'ютарную тэкстуру, з дамаляванымі дажджынкамі, але пры гэтым цалкам пазнавальныя — тут ужо ў малых увага павінна спрацаваць фантазія. Дзіця зразумее, што і яно можа стварыць нешта падобнае, паспрабуе і... хто ведае, як зменіцца яго светапогляд?

Дзіцячая кніга павінна быць насычана колерам. Я б нават сказала, што не баюся яе перанасыціць, бо першыя кнігі запамінаюцца на ўсё жыццё. Адсюль і павага да дэталяў: ад валошкавых вачэй у сонейка да чарвяка ў яблыку і зярнятак у сланечніку. Асабліва важныя элементы — рукі і вочы — прамалёўваю з павелічальным шклом. Вядома, ёсць розныя стылі, але мне хочацца, каб гэта былі не проста вочы, а позірк, не проста рукі, а жэсты.

***— Наколькі важная дакладнасць? Здаецца, дзіцячы малюнак, — ён даволі ўмоўны, стылізаваны...***

— Ёсць розныя мастакі, і я знаёмая з многімі добрымі графікамі, якія распрацавалі свой стыль. Мне ж падабаецца маляваць «сумленную натуру». Памятаеце, як у Леанарда да Вінчы? Трэба ўбачыць шкілет, а ўжо потым прыдумляць крылы, калі зразумееш, куды яны мацуюцца. Зразумела, не абавязкова для дзіцячай кніжкі змалёўваць зайца з энцыклапедыі. Але трэба ведаць, з чаго «складаецца» той заяц, каб на гэтай аснове прыдумаць персанажа пазнавальнага знешне, але казачнага, блізкага для дзяцей.

***— Чаго стараецеся пазбягаць у малюнках?***

— Банальнасцяў і паўтораў. Напрыклад, ілюструем рыбалку. Самае простае — намаляваць лінію берага, вось сядзіць хлопчык, вось вуда, там вада... А можна пайсці іншым шляхам і абысціся без усяго названага. Намаляваць кладку, шчупака, ваду і адлюстраванне ў ёй. Атрымліваецца новая кампазіцыя, без стэрэатыпаў, з якімі мы знаёмімся, бадай, з дзіцячага садка. Пазбавіцца ад іх цяжка, але хочацца, каб потым дзеці ведалі, што сонца было не толькі «на ўсходзе, на захадзе і недзе пасярод». Каб яны мыслілі без абавязковай лініі гарызонту. Кніжны графік нясе новаму, сучаснаму пакаленню абсалютна праўдзівую інфармацыю пра навакольны свет з усёй яго дабрынёй, прыгажосцю. Таму часам сядзіш і ламаеш галаву: як намаляваць маладзік (перамалёваны не адзін дзясятак разоў!), каб не паўтарыцца. Да таго ж не псаваць кнігі паўторамі — гэта весела.

***— У вас ёсць любімы персанаж ілюстрацый?***

— Вельмі люблю сонца. Можна сказаць, што гэта ўжо «мой» элемент у кнігах.

***— Вы вучыце дзяцей у гімназіі. Наколькі творчымі атрымліваюцца іх работы? І ці не спрабавалі рабіць малюнкі для выданняў разам?***

— Ідэі падказваю. Магу прыблізна назваць тэму і заахвоціць, каб было весела працаваць і каб яны не капіравалі нешта падгледжанае, а прыдумлялі сваё.

> **«Стараюся адчуць кожны твор, тады аўтар сам падштурхне сваім стылем да пэўных эксперыментаў, ад гэтага і будзе залежаць выгляд кнігі пасля выхаду з друку».**

Што тычыцца другога пытання... У вучэбнай праграме ёсць такое заданне. Праўда, кнігу, праілюстраваную дзецьмі, рэдка дзе ўбачыш, — гэта звязана з патрабаваннямі выдавецтваў, хоць мне здаецца, што яна магла быць нічым не горшай, чым працы дарослых мастакоў. З іншага боку, дзіцячыя работы можна аформіць у праект, асабліва, калі і аўтар тэкстаў будзе зацікаўлены. Тут важна яшчэ і тое, што дзеці хочуць, каб іх працу бачылі, а не заўсёды гэта магчыма — малюнкі абразаюць, частка з іх не ідзе ў друк — і гэта цалкам нармальная сітуацыя для ілюстратара.

***— Вы выкладаеце, пішаце карціны, робіце ілюстрацыі... А што б яшчэ хацелася зрабіць?***

— Апошнія гады вяртаецца захапленне маладосці: хочацца пісаць вершы. Не скажу, што гэтым усур'ёз займаюся, але заўсёды бяру з сабой нататнік, бо вельмі шмат прыходзіць цікавых думак у транспарце. Магчыма, гэта шанц паспрабаваць сябе ў новым кірунку творчасці.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ

БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

# Медыцынскі брэнд «Лечымся ў Беларусі»

**Каманда маладых супрацоўнікаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі (БелМАПА) пад эгідай і пры актыўнай падтрымцы кіраўніцтва ўстановы стварыла анлайн-сэрвіс для прасоўвання і продажу комплексу паслуг у сферы медыцынскага турызму «Клінікі Беларусі» і адаптаваную мабільную праграму да яго. Распрацоўка прайшла ў фінал рэспубліканскага конкурсу БРСМ «100 ідэй для Беларусі».**

— Чаму мы лічым актуальным вырашэнне пытання прыцягнення ў краіну замежных грамадзян для аказання ім высокакваліфікаванай медыцынскай дапамогі? — тлумачыць **мадэратар праекта, навуковы супрацоўнік навукова-даследчай лабараторыі БелМАПА Ганна РАМАНЮК.** — Па-першае, медыцынскі турызм — адзін з перспектыўных кірункаў развіцця сучаснай сістэмы аховы здароўя, які здольны павысіць прэстыж беларускай медыцыны на міжнародным узроўні, стварыць пазнавальны брэнд нашай краіны і падтрымаць імідж развітай высокатэхналагічнай дзяржавы ў вышэйназванай сферы. Па-другое, бясспрэчна, як і любая турыстычная дзейнасць, медыцынскі турызм нясе прыбытак. Прычым даходы, якія прыносяць звычайныя турысты, нельга параўноўваць з тымі, што даюць медыцынскія турысты. Так, у Турцыі сярэдні чэк па іх абслугоўванні складае 2,5 тысячы долараў, у той час як чалавека, што прыехаў пазагараць на пляжы, — 650 долараў. У Ізраілі, адпаведна, крыху больш за 4,7 тысячы і 1 тысячу долараў, у Іарданіі — 5 тысяч супраць 3 тысяч долараў. Пагадзіцеся, розніца адчувальная.

80 працэнтаў каманды складаюць людзі з вышэйшай медыцынскай адукацыяй, якія маюць вялікі вопыт практычнай работы. Многія з арганізатараў, нягледзячы на свой малады ўзрост, маюць не адну вышэйшую адукацыю і досвед стварэння і развіцця інтэрнэт-праектаў у галіне навукі і медыцыны.

Асноўнымі карыстальнікамі сэрвісу будуць замежныя грамадзяне, якія захочуць атрымаць высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу ва ўстановах аховы здароўя Беларусі. А магчымасці анлайн-кансультавання дазволяць людзям, якія занятыя сваёй кар'ерай і цэняць уласны час, не выходзячы з дому, атрымліваць высокакваліфікаваныя кансультацыі спецыялістаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*rs@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
4 02 2016 г.

*Прэм'ера рубрыкі*

# ПАЦЯРПІЦЕ ТРЫ ТЫДНІ



З Наталляй Лубнеўскай

**Каб прывучыць сябе рэгулярна займацца спортам, я выбрала самы нечаканы варыянт — стала фітнес-інструктарам. Паралельна з асноўнай адукацыяй скончыла курсы пры фізкультурным універсітэце і цяпер настройваю на працу з целам іншых.**

Ведаеце, якія мае любімыя кліенты? Поўныя. Бо калі ў залу прыходзіць чалавек з відавочна лішнімі кілаграмамі, каб пазбавіцца ад іх, у цябе з'яўляецца азарт. Ты, як і сама кліентка, спадзяешся на выніку ў лепшых традыцыях падборкі «да/пасля». І гатова працаваць. Шкада, што яна — не: увесь запал знікае ўжо праз дзесяць хвілін трэніроўкі, бо становіцца цяжка. Між тым тлушч яшчэ нават не пачаў «згараць», гэта адбываецца толькі на 20-й хвіліне. Здаюцца, вядома, не адразу — недзе праз тры трэніроўкі. Стамляюцца чакаць вынікаў.

Вось не кажыце толькі, што не хацелі б усё і адразу. Знаёмы, які прадае спартыўныя трэнажоры, узгадваў, як аднойчы тэлекрама пусціла рэкламу супер-прылады для прапрацоўкі прэса. Пакупнікі на канапе не дурні: каб набыць трэнажор танней, пачалі пытаць пра яго ў звычайных салонах. Прадаўцы вырашылі скарыстацца ажыятажам. Накупілі тых прыстасаванняў. Спачатку попыт быў шалёны, а потым, разам з рэкламай, інтарэс знік зусім. Акрамя таго што супер-эфекту трэнажор не даваў, ён яшчэ і зроблены быў абы-як. У таго знаёмага ўжо колькі месяцаў пыліцца на сховішчы партыя прылад, і ніякія зніжкі не дапамагаюць яе распрадаць.

Ды што там іншыя... З сяброўкамі неяк абмяркоўвалі, што ў кожнай гісторыі пахудзення мы спадзяёмся ўбачыць лёгкі рэцэпт. Кшталту «ешце, што заўгодна, толькі выпівайце кубак вады з лімонам штораніцу, і будзе вам шчасце». Пакуль адно расчараванне. Бо сакрэт, зразумела, адзін і той жа — трэба менш есці.

Прыходзячы да інструктара, дзяўчаты часам, здаецца, таксама чакаюць нечага неверагоднага. У ідэале — методыку, якая патрабуе ад іх мінімум высілкаў. Нездарма ж цяпер усё большую папулярнасць набываюць ЭМС-трэніроўкі (калі на мышцы ўздзейнічаюць электрычным токам). Чалавек падчас такога занятку — ён доўжыцца ўсяго толькі 20 хвілін — можа выконваць самыя простыя практыкаванні, пры гэтым мышцы будуць працаваць у інтэнсіўным рэжыме. Праўда, і каштуе цудадзейная методыка нятанна. Каля 250 тысяч за трэніроўку, у 4 разы даражэй за звычайную.

Але нават ЭМС-фітнес патрабуе рэгулярнасці. А гэта, бадай, самае складанае ў трэнінгу — дайсці да залы. Хочаце змен у фігуры — займайцеся два-тры разы на тыдзень. Адзін — гэта так, для агульнага аздараўлення. Каб не паглыбляцца ў падрабязнасці, скажу толькі, што ў адпачынку ёсць некалькі фаз. І калі наступная трэніроўка ў вас толькі праз тыдзень, то на фазу суперкампенсацыі (калі працаздольнасць арганізма павышаная і эфект адпаведна найлепшы) вы не паспяваеце. Некаторыя дзяўчаты абанемент на восем заняткаў расцягваюць на некалькі месяцаў. І потым шчыра здзіўляюцца, што ні на кілаграм за гэты час не пахудзелі. «Я ж пастаянна трэніруюся». Ага, таму і вага пастаянная.

Кажуць, не хапае матывацыі. Прыгожая «адмазка», але давайце скажам, як ёсць: ля-но-та. У аднаго расійскага фітнес-блогера прачытала цікавую думку наконт гэтага. Ён лічыць, што ніякай матывацыі не існуе наогул і выхоўваць яе ў сабе бессэнсоўна. Гэтае паняцце прыдумалі, каб зарабляць грошы на псіхалагічных трэнінгах. Насамрэч усё куды прасцей: табе або хочацца нешта зрабіць (і для гэтага не трэба сябе заахвочваць), або не. Вы ж не ўгаворваеце сябе пасядзець у кавярні з сябрамі?

Калі цяжка, не трэба адмаўляцца ад спорту адразу. Вядома, інструктар спрабуе загрузіць вас па максімуме, але, паверце, вы працуеце на мяжы. Адно з правілаў, якое прасіць запомніць трэнераў: кліент заўсёды знойдзе магчымасць адпачыць. Таму не пужайцеся, што фітнес-праграма вам не пад сілу. Пачакайце тры тыдні. Столькі арганізму патрэбна, каб прызвычаіцца да новага рэжыму. І каб сталі заўважнымі першыя вынікі. Пры ўмове, вядома, што трэніраваліся вы рэгулярна.

*У ліку найлепшых*

# ІНТЭЛЕКТУАЛЫ З ХОДАСАЎ ПЕРАМАГЛІ Ў МАСКВЕ

**Чацвёрты раз каманда Ходасаўскай сярэдняй школы Мсціслаўскага раёна брала ўдзел у міжнароднай інтэлектуальнай алімпіядзе «Эрудыты планеты», якая праходзіла ў Маскве. І калі ў першы раз школьнікі былі восьмымі, потым шостымі, летась у агульнакамандным заліку занялі чацвёртае месца, дык на гэты раз іх чакала доўгачаканая перамога.**



— Алімпіяда патрэбна, каб развіваць у дзяцей творчыя здольнасці, раскрываць інтэлектуальны патэнцыял і выяўляць новыя таленты. Удзел у ёй дазваляе школьнікам пашырыць свой кругагляд, прымяніць уласныя веды, эрудыцыю і лагічнае мысленне, праявіць уменне прымаць рашэнні ў нестандартнай сітуацыі і здольнасць працаваць у камандзе ва ўмовах абмежаванага часу, — расказала **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Ходасаўскай сярэдняй школы Тарэса Сямёнава.**

Сёлета на алімпіяду ў Маскву з'ехалася больш за 150 удзельнікаў, якія прадстаўлялі 25 найлепшых камандаў з устаноў адукацыі Расіі, Беларусі, Эстоніі і Таджыкістана. Усе каманды былі падзелены на чатыры ўзроставыя групы. Каманда Ходасаўскай школы выступала ў юнацкай групе, у якой спаборнічалі 54 удзельнікі. У расійскай сталіцы Мсціслаўскі раён і саму Беларусь прадстаўляла каманда «Новы дзень» у складзе Вадзіма Налівайкі, Дзіяны Крупскай, Іны Валошынай, Яны Дзядковай, Марыі Зямцовай і Святланы Рыбаковай. Рыхтаваў удзельнікаў да спаборніцтваў настаўнік інфарматыкі Аляксандр Уладзіміравіч Сямёнаў.

Асноўнымі конкурсамі алімпіяды былі «Візітная картка», інтэлектуальнае тэсціраванне, лагічныя і займальныя задачы, інтэлектуальнае мнагаборства і брэйн-рынг. Па іх выніках школьнікі прывезлі з Масквы не толькі дзесяць кубкаў у розных намінацыях, але і сертыфікат на 100 тысяч расійскіх рублёў для адпачынку ў гатэлі «Эдэльвейс» у Адлеры. Апроч непасрэдна спаборніцтваў дзецям запомнілася наведванне маскоўскага Крамля і сабора Васілія Блажэннага, прагулка па культурна-забаўляльным комплексе «Крэмль у Ізмайлаве», наведванне карабля Пятра І, кавальскага двара і яшчэ шмат чаго іншага.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Смех дый годзе!*

# МІКРАФОН ДЛЯ КОМІКА

## А гумар — для паўналетніх

**Фёдар Булкін, 24-гадовы супрацоўнік адной з паліграфічных фірмаў, для смалявіцкай моладзі фігура, можна сказаць, знакавая. Дзякуючы сваім жартам пра родны райцэнтр ён засвяціўся на расійскім тэлебачанні, рассмяшыў Гарыка Марцірасяна і Сяргея Светлакова, а цяпер разам з аднадумцамі развівае гумарыстычны праект Stand Up Region, які з часам мусіць аб'яднаць прадстаўнікоў усіх абласцей краіны. Перад чарговым выступленнем мы сустрэліся ў смалявіцкім Доме культуры.**

— Стэндап — жанр, у якім комік смяецца з жыццёвых праблем. Гэтыя рэчы бачаць усе, але ён прапануе сваю пазіцыю праз жарт, дзеліцца асабістымі перажываннямі, — праводзіць лікбез Фёдар. — У Мінску стэндап развіваецца ўжо некалькі гадоў. Ёсць некалькі клубаў, дзе стэндаперы могуць папрактыкавацца. Мне, у сваю чаргу, проста захацелася, каб гэты напрамак пачаў развівацца ў нашым горадзе-спадарожніку. Я стварыў творчае аб'яднанне, у якое ўвайшлі ўсе комікі гэтага жанру з нашай краіны. Разам са сваім паплечнікам Тарасам Нікіціным праводжу стэндапы ў Жодзіне. Цяпер на чарзе Вілейка, Салігорск, Пінск...

Булкін прыгадвае дэбютную вечарыну ў Смалявічах і лічыць, што першае цялятка шчаняткам не стала. «У зале сабралася сто чалавек. Тады да нас прыехалі хлопцы, большасць з якіх ужо выступалі на розных тэлеканалах. Іх ведалі. Усё прайшло добра, гледачам спадабалася. У нас у з'явіліся пастаянныя наведвальнікі».

Фёдар кажа, што з кіраўніцтвам Дома культуры атрымалася дамовіцца без перашкод, але арганізатарам кожны раз давядзецца выконваць адно патрабаванне: уваход на выступленне дазволены толькі паўналетнім. Дзеля гэтага ў гледачоў на ўваходзе нават правяраюць пашпарты. Уваход платны, але гэта нікога не бянтэжыць.


Андрэй Макаёнак жартуе з аб'яў прыпынкаў у электрацягніках.

...За гадзіну да выступлення ўсе ўдзельнікі збіраюцца ў метадычным кабінеце, які замяняе ім грымёрку. Сярод чатырох хлопцаў заўважаю адну дзяўчынку. Яна, як мне сказалі, сапраўдны самародак. Папершае, з'яўляецца «піянерам» сярод нашых дзяўчат-стэндапераў, а, па-другое, трапіла ў стэндап адразу, у КВЗ ніколі не ўдзельнічала.

— Мае сябры сказалі, што я смешная, і параілі паспрабаваць сябе, — прызнаецца Надзея Кулік. — Жартую з сябе. Спачатку жартавала з таго, што ў мяне не было хлопца, пасля — з таго, што ён мяне кінуў. Ну а цяпер расказваю пра тое, што мы калісьці пакляліся памерці ў адзін дзень. Цяпер я хварэю — праблемы з носам. І больш за ўсіх перажывае мой былы хлопец. У яго інтарэсах, каб я папраўілася.

Андрэя Макаёнка, першага ўдзельніка, зала сустракае нясмелымі апладысментамі. Андрэй гумарыць пра стасункі, дзяўчат, сям'ю і нават пра сумны голас з рэпрадуктараў у электрычках.

— Вы чулі, як у электрычках аб'яўляюць прыпынкі? — пытаецца ён у гледачоў і пачынае парадзіраваць. — «Наступны прыпынак Радашковічы...» Калі гучыць такі голас, я чакаю сумную гісторыю з жыцця. Вы ніколі не пачуеце: «Гэй, усім прывітанне! Мы едзем у горад разгулу Радашковічы! Праз некалькі хвілін да вас прыйдуць мае прамоўтары і прапануюць стылёвыя шкларэзы і сканворды. А на станцыі Аляхновічы вы пачуеце сапраўдны беларускі гармонік!».

Калі чарга дайшла да Тараса Нікіціна, апошняга ўдзельніка выступлення, зала смялялася з кожнага жарту, і кожную мініяцюру суправаджала апладысментамі.

— Наведвальнікі паўсюдна розныя, таму і жарты ўспрымаюць па-рознаму, — прызнаўся пасля Тарас, якога атачылі ахвотныя з ім сфатаграфавацца. — Але мне тут усё спадабалася. Будзем працягваць выступаць і працаваць далей.


Фота Тамары БАЙКОВАЙ.
Гледачам выступленне спадабалася.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

*Друкуецца ў «Маладосці»*

**Лаканічна, але змястоўна выказваць свае думкі атрымліваецца не ў кожнага аўтара.**
**У падборцы пад назвай «Маленькія апавяданні», якая выйдзе ў №1 часопіса «Маладосць», аб'яднаны невялікія па аб'ёмах творы абсалютна не падобных паміж сабой аўтараў, якія ўмеюць выказваць свае думкі менавіта так. Нечаканыя павароты сюжэтаў, простыя, але вельмі патрэбныя жыццёвыя ісціны — тое, што вы адшукаеце ў «Маленькіх апавяданнях». Прапануем вашай увазе два творы з гэтай падборкі.**



## Літаратурны дуэт ТАТМІР

# ЗАЎТРА

Містычна-бытавое апавяданне

УЛАДЗІМІР Сцяпанавіч Буслаеў вярнуўся з крамы крыху нападпітку. Сустрэў у гастраноме сябра, з якім не бачыліся больш за паўгода, і вырашылі нагнаць упушчаны час у кафетэрыі. Частаваў Сяргей. Пагаманілі пра жыццё, згадалі мінулае. Нават, пра тое, як у першым класе настаўніцу на дошцы ў выглядзе Бабы Ягі ў суаўтарстве намалявалі, успомнілі. Абодвум тады перапала. Прыгадалі, і як працавалі разам кіроўцамі «КамАЗаў». Брыгадзіра свайго, шэльму, нядобрым словам успомнілі. Увогуле, памарылі пра мінулае па-старэчы, як належыць. Заелі бутэрбродамі з нарэзкай парцыённую гарэлачку і разышліся-распаўзліся кожны ў сваю добраўпарадкаваную гарадскую нару марыць ужо ў адзіноце.

Думалася Уладзіміру Сцяпанавічу пра сына Рамана, які на мінулы яго, бацькі, дзень нараджэння ў падарунак мікрахвалёўку на кухонны стол з усім належным у такіх абставінах бадзёрым балаканнем паставіў, інструкцыю ў рамачцы на бачнае месца прысабачыў ды так і знік на паўгода з жыцця бацькі. Тэлефанаваў яму Уладзімір Сцяпанавіч, тэлефанаваў, ды няма калі Ромку нудныя размовы весці, бацькавы нетаропкія разважанні выслухоўваць: працаваць трэба, жонку Веру забяспечваць. Вось толькі дзіўна, чаго з дзіцем цягнуць? Хочацца ўнука дачакацца. Ды ўсё, вядома, разумеў Уладзімір Сцяпанавіч і, на сынаў эгаізм з вежы ўласнага перажытага пазіраючы, не крыўдзіўся, але ўсё адно неяк тужліва яму аднаму ў двухпакаёвай кватэры жылося. Вось калі яшчэ Рая жывая была... Так вось, у неадчэпных разважаннях ды мроях, і бавіў свае самотныя дні Уладзімір Сцяпанавіч, рана састарэлы шасцідзесяцігадовы мужчына.

А сёння штосьці наогул моташна на душы было. Ці то сустрэча з аднакашнікам развярэдзіла яе, душу гэтую, ці то нарэзка нясвежая аказалася... Успомніўшы строгія забароны свайго ўчастковага лекара, Буслаеў сумна ўсміхнуўся.

Калі на электронным будзільніку з зязюляй лічбы сталі здавацца не зусім ужо недарэчнымі для сну, Уладзімір Сцяпанавіч сцягнуў з сябе ўтульную фланелевую кашулю і залез пад цёплую коўдру. Як заведзена, памарыў перад сном пра заўтра, склаў немудрагелістыя планы, а потым заснуў.

Сны Уладзіміру Сцяпанавічу заўсёды сніліся яркія, маляўнічыя, у адрозненне ад шэраватай паўсядзённасці старога самотніка. І на гэты раз душа, якой таксама абрыдла аднастайнасць, не падвяла.

Апынуўся ён у цёмнай вільготнай задусе в'етнамскага гушчару, дзе ў маладыя гады выконваў у складзе абмежаванага кантынгенту інтэрнацыянальны абавязак у дачыненні да братняга камуністычнага народу ў яго барацьбе з капіталістамі. Бег сяржант Уладзімір Буслаеў з поўнай выгрузкай за вузкавокім праваднікам. Мільгалі ў зялёным змроку ствалы дрэў, узнікалі і прападалі тут і там зыркія жоўтыя слупы сонечнага святла, што нейкім дзівам прарываліся скрозь зялёныя шаты. Цяжка дыхалі побач хлопцы з ягонага загінулага, зніклага пад казённым грыфам «Сакрэтна» ўзвода. Марш-марш!.. Мясцовасць пайшла ўгару. Бегчы стала цяжэй, але нічога, бывала і горш — перапрываем і цяпер.

У звыклы роўны гул дрэў уплёўся іншы. Ён вібрыраваў нізка і ледзь чутна, амаль вуркатаў, пераплятаючыся з галасам джунгляў. Спачатку на яго ніхто не звярнуў увагі. А потым жывы гул дрэў патануў у гэтым новым гуле і дробна задрыжала, захадзіла пад ботамі гарачая зямля. Што гэта з ёй? Насустрач Уладзіміру, проста яму ў твар разам з грукатам і вострым смуродам ірвануў пякучы вецер. Сяржант Буслаеў і не заўважыў, як хлопцы кудысьці прапалі ў вакханаліі авіяналёту. Ён бег адзін. Знік некуды і вузкавокі дробны праваднік. Але Уладзімір і так ведаў: любой цаной яму трэба дабегчы туды, дзе цяпер трасе і цяжка грукоча.

Раптам зямля моцна падкінула Уладзіміра, быццам надумала пазбавіцца ад яго. Ногі адарваліся ад глебы, ён павольна, нібы ў вадзе, праляцеў, куляючыся, і яго шпурнула ў нейкую цясніну. Кустоўе змякчыла падзенне, і ўдару Уладзімір не адчуў. Затое адчуў, што цяпер ён сціснуты гарачай зямлёй. Цяпер трэсла і крычала аднекуль ззаду. А выратаванне было наперадзе. Належала ўсяго толькі прабрацца наперад. Здавалася, што цеснае вусце праходу вось-вось самкнецца яшчэ мацней і ўжо ніколі не адпусціць яго. Сяржант Буслаеў — ці ўжо не сяржант? — адчуваў, што задыхаецца. Ён праплішчваўся з усяе сілы, хапаўся рукамі, укручваўся галавой і плячыма. Выхад, паратунак быў наперадзе. Ён адчуваў, што яму трэба толькі выбрацца адгэтуль — і ён абавязкова прачнецца, і нарэшце наступіць заўтра.

Ён паспеў! Зрабіў апошні рывок і адчуў свабоду. Перад затуманенымі вачыма ўспыхнула яркае-яркае святло, і ён закрычаў. Аднекуль збоку нібыта зноў наляцеў басавіты рокат самалёта. І на гэты раз ён вуркатаў: «Хлопчык. У цябе хлопчык, Верачка. Усё ўжо! Бач, які гарласты! Ну, што ты крычыш? Зараз аддамо маме. Як назавеш першынца, Вера?»

І нейкі дзіўна знаёмы, немагчыма прыцягальны голас адказаў гэтаму рокату: «Мы з мужам вырашылі, калі сын народзіцца — Валодзечка будзе. Як дзядуля, Уладзімір Сцяпанавіч. Вельмі пра ўнука марыў, ды так і не дачакаўся...»

І сонца бліснула ў вочы, і шчасце, неймавернае шчасце цеплыні рук пяшчотных, паху салодкага, голасу мяккага ахінула, заглушыла нядаўні боль, залюляла новага чалавечка, Уладзіміра Раманавіча Буслаева!..

## Рагнеда ЮРГЕЛЬ

# ДАМА З КНІГАЙ

КАЛІ апошнія промні сонца адгарэлі на кляновых вершалінах, яна нетаропка адклала кнігу, якая паспела ўжо надакучыць, і з задавальненнем выпрастала плечы. Пачынаўся вечар. Стаяла тая дзівосная пара, калі восень замірае, прыслухоўваючыся да цішыні, а вакол — глыбокая сінь неба і сонечны колер лісця на паркавых дрэвах. У такі час дзень яшчэ захоўвае летняе цяпло, а ноч папярэджвае раннім холадам пра блізкія дажджы.

Але яна не баялася холаду. Ён ужо даўно паспеў стаць яе заўсёдным і звыклым спадарожнікам. Яна какетліва паправіла мяккі капялюшык з пер'ем за шырокай стужкай, абтрэсла ад выпадковых парушынак доўгую сукенку і паднялася з пазелянелай паркавай лаўкі. Спачатку яе крокі былі павольнымі, нерашучымі, аднак хутка анямелае цела зноў стала паслухмяным і гнуткім.

Пакуль цемра канчаткова не схавала горад, яна рушыла ў глыбіню парку. Цяпер яго дарожкамі праходзілі толькі закаханыя, занадта занятыя, каб заўважаць нешта яшчэ. Толькі прыпознены пенсіянер некалькі імгненняў узіраўся ў самотную дзявочую фігурку ля возера, што быццам баялася падысці бліжэй да вады.

Яна і сапраўды адчувала незразумелы страх перад гэтай люстраной паверхняй. Унутры жыло прадчуванне, што вада ніколі не здолее вытрымаць яе, ды і зямля на дне занадта мяккая і сквапная — праглыне за дзень. Ну, магчыма, за два.

Аднак лебедзі добра ведалі яе слабасць і таму падплывалі да самага берага, прыгожа выгінаючы доўгія шыі.

Ноч падкралася незаўважна, цемру разбілі плямы ліхтароў. Можна было выходзіць у горад, але яна яшчэ нейкі час палюбавалася на спакойнае люстра возера — час прывучыў яе не спяшацца.



Паркавая алея вывела на шырокую вуліцу. Там пакуль рухаліся людзі і аўтамабілі. На яе азіраліся — позіркі былі альбо цікаўнымі, альбо насмешлівымі.

Дзве плошчы, бібліятэку і гарадскую бальніцу яна мінула адразу — цэнтр ніколі не вабіў яе сваёй мітуслівасцю, рэзкімі гукамі, каляровымі агнямі. Іншая справа — ускраіны. Нават гэты правінцыяльны горад рос і змяняўся з неверагоднай хуткасцю. З'яўляліся будынкі са шкла і бетону, болела машын на вуліцах... Яна памятала гэты горад не такім, і вярталася туды, дзе яшчэ стаялі аднапавярховыя дамкі і дрэвы прыветна цягнулі галіны над парканамі.

Яна павольна крочыла адной з такіх ціхіх вулачак, калі рэзкі свет фар і злосны гудок прымусілі яе адскочыць на ўзбочыну. Кіроўца крыкнуў у прыадчыненае акно нешта рэзкае, абразлівае, і яна доўга супакойвала дыханне, намагаючыся зразумець яго словы. За апошнія тры гады яна нядрэнна навучылася перакладаць самыя розныя выказванні. Некаторыя з іх здаваліся смешнымі, некаторыя — бессэнсоўнымі, і яна паспачувала людзям, што кожны дзень вымушаны былі іх казаць і ўхіляцца ад грукатлівых жалезных пачвар.

Наогул, ноч была самая звычайная. Праўда, у адным завулку ёй сустрэлася нецвярозая кампанія, але, пабачыўшы, што далонь незнаёмкі з лёгкасцю пакідае след нават на ліхтарным слупе, прыціхлыя гулякі не асмеліліся яе затрымліваць. Яшчэ на адной вуліцы ёй параілі не бадзяцца пад вокнамі, а за наступным паваротам нагнала жартаўлівае запрашэнне выпіць піўка.

Ноч пераваліла за сярэдзіну, калі за яе спіной нехта прамовіў:

— Вы не баіцеся хадзіць так позна?

— Не, — яна азірнулася. Хлопец з цікаўнасцю разглядаў яе, паклаўшы рукі на вясніцы.

— Вы не заблукалі? Дарэчы, у вас такі незвычайны выгляд...

Яна на імгненне збянтэжылася, але адказ быў даўно прыдуманы і адрэпетаваны:

— Усё добра, я вяртаюся з тэатральнай вечарыны.

Малады чалавек нечакана ўсміхнуўся:

— Ведаеце, вам нават да твару гэты капялюшык са стужкай і доўгая сукенка. Вы нібы з казкі прыйшлі.

А потым была размова ні пра што і пра ўсё. Ён назваў сябе, яна таксама паспешліва адшукала ў памяці адно з жаночых імёнаў, што выпадкова чула на вуліцах. Хлопец не спяшаўся вяртацца ў дом, а яна забылася, што хацела выйсці за горад. Калі з'явілася тонкая шэрая палоска на ўсходзе, ніхто не заўважыў...

Сонца ўжо выпусціла першыя промні, калі наперадзе паказаўся парк. У гэты час горад зусім апусцелы, і таму яна бегла, не разбіраючы дарогі. Ранішні туман усцілаў зямлю, глушыў таропкія крокі. Ёй ніколі не даводзілася так позна затрымлівацца. Вось і нязменная лаўка. Адсырэлая кніга. Яна, не гледзячы, разгарнула шэрыя старонкі, на якіх, зрэшты, не было ніводнага надпісу. Думкі нязвыкла мітусіліся ў галаве: «Цікава, гэты хлопец забудзецца, што сустрэў мяне ноччу? Звычайна яны ўсе забываюць». Новы дзень не дазваляе ёй заставацца ў чалавечай памяці. Шкада: гэты чалавек аказаўся цікавым суразмоўцам, што было рэдкасцю ў яе доўгім жыцці.

Світанне разгаралася, і адначасова набіраў сілу першы восеньскі марозік. Аднак яна не адчувала яго. Іншы, асаблівы холад пачынаў пакрысе скоўваць яе цела, і, калі сонечныя промні вызалацілі парадзелую кляновую вяршаліну, яна яшчэ паспела падумаць: "Сёння ў горадзе свята. Абавязкова трэба схадзіць на тую вуліцу... Ён нават кагосьці мне нагадвае... Заўтра... калі... сонца..."

***

У другой палове дня гулянне перамясцілася ў парк. Дзеці бегалі па алеях, збіралі букеты з лісця, кідалі іх у сіняе, звонкае ад павуцінак неба. Дарослыя з асалодай дыхалі прахалодным паветрам, прагульваліся ля возера.

— Ану, Наташа, сфатаграфуй мяне ля нашай «Дамы з кнігай»! — немалады таўставаты мужчына працягнуў жонцы фотаапарат, а сам са смехам абняў за плечы худзенькую дзяўчыну ў старамодным капелюшы і доўгай сукенцы з карункавымі рукавамі.

Дзяўчына сядзела на краечку лаўкі, крыху схіліўшы галаву, і чытала кнігу. Ёй не было справы да таго, што дзеецца навокал. Бронзавыя скульптуры надзвычай абыякавыя да ўсяго.

SEX-БАЛЯСЫ

# ПРА ГЕРОЯЎ І ПЕРСАНАЖАЎ

**Нядаўна ў інтэрнэце панеслася хваля абурэнняў у дачыненні да... старых савецкіх фільмаў, якія даўно ўжо сталі класікай кінематографа. Як так? А вось так, у традыцыях цяперашніх часоў, у адпаведнасці з ланцуговай рэакцыяй. (Памятаеце, з «Залатога цяляці»: «Падвёў Скумбрыевіч! Не вытрымаў вочнай стаўкі...») Маўляў, надакучыла гэтая старызна, кожны год адно і тое ж паказваюць, колькі можна?!. Дасталася не толькі самім фільмам, — карыстальнікі сеціва ад душы прайшліся і па героях. Найбольш абрынуліся на Лукашына з «Іроніі лёсу». Маўляў, мамчын сынок, лузер, як кажуць цяпер, ды яшчэ і нападпітку ляціць немаведама куды, а ўжо там маральна няўстойлівая настаўніца ледзьве не адразу кідаецца яму на шыю. Дарэчы, па іроніі лёсу ўсе, каму не лянота, накінуліся і на яшчэ аднаго героя акцёра Андрэя Мягкова — Навасельцава са «Службовага рамана». Ну так, напачатку яго цяжка назваць брутальным мужчынам, дастаткова прыгадаць адну толькі фразу: «у мяне іх двое: хлопчык... і таксама хлопчык. Два хлопчыкі». («Насамрэч «Маша і мядзведзь» — гэта мульцік для дарослых. Пра цяжкі шлях бацькі-адзіночкі».)**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Напачатку хачу сказаць, што часам жыццё падкідвае сюжэты, не горшыя за сцэнарый фільма. (Менавіта так многія ранейшыя стужкі і здымаліся. Магчыма, у гэтым і крыецца сакрэт іх поспеху.) І не трэба выносіць канчатковы прысуд па нейкім адным учынку чалавека. Вось нядаўні прыклад. У Брэсце ноччу дзяржаўтаінспектары затрымалі 21-гадовую нявесту нападпітку, якая ехала... вызваляць з апорнага пункта міліцыі сваіх сябровак. Як яны туды трапілі, гісторыя маўчыць, але, відаць, дзявочнік напярэдадні атрымаўся на славу! Вось толькі мне асабіста чамусьці стала шкада гэтую дзяўчыну, у якой літаральна ранкам пасля здарэння было прызначана вяселле. Добра, што яно яшчэ ўвогуле адбылося... (Як там казаў Адрыяна Чэлентана ў стужцы «Утаймаванне свавольніка»? «Я абавязкова на табе жанюся, у крайнім выпадку сазвонімся».) Разам з тым нявесту пазбавілі правоў кіроўцы на тры гады, і ёй давядзецца выплаціць немалы штраф. Магчыма, з падораных на ўрачыстасць грошай. («Ты калі-небудзь баяўся мяне страціць?» — «Вядома! Неяк мы ішлі на аўтобус... Я адстаў, а ў цябе былі грошы на праезд».) Зноў жа нядаўняя гісторыя з 15-гадовай дзяўчынай грузінскага паходжання, якая адбылася ў сталіцы: школьніца прапала, а потым высветлілася, што яна ўцякла ад бацькоў, калі даведалася, што яе збіраюцца аддаць замуж не за таго, і хавалася ў сваякоў свайго сапраўднага каханага. Вуаля, можна здымаць сучасны рымейк хоць «Вяселля ў Малінаўцы», хоць «Каўказскай палоннай». А можна проста пагаварыць пра каханне...

**Гісторыя «Красуні» Джуліі Робертс пераконвала, што мары збываюцца. Мушкецёры караля былі «адзін за ўсіх, і ўсё за аднаго» і ў гэтым, як спявалі любімыя героі, «быў наш поспех». Агульны: і акцёрскі, і глядацкі.**

Дарэчы, і пра сіквелы, і пра каханне. Хто б і што б ні гаварыў пра «старызну», а пост амерыканскага акцёра Рычарда Гіра ў сацыяльнай сетцы пра магчымасць працягу фільма «Красуня» набраў 1,1 мільёна лайкаў і 70 тысяч рэпостаў за 14 гадзін! Так актыўна гледачы галасавалі за ідэю зняць сіквел папулярнай рамантычнай стужкі 1990 года. І хаця ўсе мы цудоўна ведаем, што вельмі часта «нельга ўвайсці ў адну і тую ж раку двойчы», гаворка ў дадзеным выпадку не пра гэта, а пра любоў гледачоў да сваіх даўніх герояў. Пра нядаўні фільм «Той, хто выжыў» чаго толькі не казалі: што гісторыя Х'ю Гласа вырвана з кантэксту і што кіношнікі ўжо зусім надзівачылі са спосабамі яго выжывання... («Аказваецца, Леанарда Дзі Капрыа ўмее плаваць ў ледзяной вадзе?!» Гэта, як вы разумееце, намёк на «Тытанік».) Але большасць была аднадушнай у думцы, нягледзячы ні на што: ды дайце вы акцёру таго «Оскара»! (Як гарачыўся ўсё ў тым жа «Залатым цяляці» абаяльны жулік Шура Балаганаў: «А Казлевічу? Усё па справядлівасці!») Вы ж толькі паглядзіце, як ён мужна змагаецца з мядзведзіцай! А калі сур'ёзна — то даўно заслужыў гэтую найвышэйшую ўзнагароду ў свеце кіно сваімі іншымі шматлікімі ролямі! Але, як гэта бывае ў жыцці, час (ці іншыя людзі) выбіралі іншых герояў...

Навасельцаў вучыў нас пераадольваць нясмеласць («Праз год у сям'і было ўжо тры хлопчыкі»). Гісторыя «Красуні» Джуліі Робертс пераконвала, што мары збываюцца. Мушкецёры караля былі «адзін за ўсіх, і ўсё за аднаго» і ў гэтым, як спявалі любімыя героі, «быў наш поспех». Агульны: і акцёрскі, і глядацкі. Хлопчыкі захапляліся мужнасцю Д'Артаньяна, дзяўчаткі — вытанчанасцю ў стасунках з супрацьлеглым полам Араміса. І тое, і другое мела значэнне для ўсіх. Старыя савецкія (ды і замежныя) фільмы — пра дабрыню, каханне, вернасць. Не скідваем з рахункаў і прыцягальную сексуальнасць акцёраў — і мужчынскую, і жаночую.

...Акадэмія кінематаграфічных навук і мастацтваў ЗША, якая з'яўляецца арганізатарам цырымоніі «Оскар», паабяцала падвоіць у сваіх шэрагах колькасць жанчын і прадстаўнікоў меншасцяў, якіх ніякая «Гарбатая гара» не выправіць... Дагэтуль журы абвінавачвалі ў расавай дыскрымінацыі, значыць, і гэты пункт абавязкова будзе ўлічаны. А ўзнагароды таксама будуць прысуджаць па разнарадцы, зыходзячы з прапорцыі акадэмікаў той ці іншай «фракцыі», каб «сваіх» не пакрыўдзіць? Сумна, спадарства, калі талент прывязваецца выключна да колеру скуры ці інтымных схільнасцяў... Як спявала вельмі папулярная ў пачатку 1990-х гадоў Анка: «А ты не лётчык, а я была так рада кахаць героя з лётнага атрада...»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ЗНАЙСЦІ СВАЮ НІШУ ЦЯЖКА, АЛЕ МАГЧЫМА»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

А што тычыцца падводных камянёў, то тут ёсць некалькі момантаў. Перш за ўсё, калі артыст вырашае ўдзельнічаць у адборы, то павінен быць гатовы да жорсткай і не заўсёды абгрунтаванай крытыкі. Трэба мець вытрымку і моцныя нервы, каб абстрагавацца ад водгукаў, каментарыяў і проста рабіць сваю справу. Важна быць упэўненым у песні, якую прадстаўляеш на адборы; у камандзе, з якой супрацоўнічаеш, і ў выніку.

***— У вас былі свае фаварыты сярод фіналістаў?***

— Шчыра кажучы, гэты год быў асаблівым. Усе фіналісты — артысты, якія толькі пачынаюць. Песні і вобразы ва ўсіх былі розныя. Асабіста мне ў роўнай ступені спадабаліся амаль усе песні, якія мы пачулі ў фінале.

***— Летась вы штурмавалі ўкраінскае шоу талентаў «Голас краіны». Як гэты конкурс паўплываў на вас?***

— Дагэтуль згадваю свой удзел у праекце з усмешкай. Я прыйшла туды вельмі заціснутая. Спяваць на «сляпых» праслухоўваннях было настолькі страшна, што, думала, страчу прытомнасць. І там мне дапамаглі многімі парадамі... Яшчэ ў мяне моцна змяніўся музычны густ, я навучылася рабіць незвычайныя кавер-версіі вядомых песень. З намі займаліся цудоўныя выкладчыкі па вакале, з якімі мы працавалі над кожнай песняй, і я стала спяваць абсалютна па-іншаму. Калі паглядзець мае раннія выступленні, то голас можна нават не пазнаць.

***— Адразу спрацаваліся з Аляксандрам Панамаровым?***

— Першапачаткова мне было вельмі страшна. Цяпер думаю, што занадта моцна сябе накручвала, бо мне, як і любому ўдзельніку «Голасу», хацелася зрабіць усё як мага лепш! Некаторыя людзі мне казалі: «Ой, толькі адзін трэнер павярнуўся — значыць, спяваеш ты не вельмі...» А я ўдзячная лёсу, што мяне выбраў толькі адзін педагог. Кожны з іх быў унікальны, але менавіта ў камандзе Аляксандра Панамарова мне ўдалося адкрыць новыя бакі ва ўласнай творчасці. Раней я ўвесь час была сканцэнтравана на джазавых песнях, выконвала іх дастаткова манерна. А аказалася, што часам трэба прасцей падыходзіць да выканання. Аднак не было побач чалавека, які б сказаў: «Лера, тут паспрабуй спяваць іначай». Аляксандр вельмі дапамог з падрыхтоўкай маёй песні да фіналу адбору на «Еўрабачанне». Калі я прыйшла да яго са сваёй першапачатковай версіяй, разумела, што ёй нечага не хапае. І сумесна з Аляксандрам і аранжыроўшчыкам Дзмітрыем Матвейчуком мы зрабілі іншую версію «Not alone», удыхнулі ў яе новае жыццё.

***— Цяпер вы жывяце паміж Кіевам і Мінскам?***

— Выступленні ёсць і тут, і там, але ў асноўным цяпер жыву і працую ў Кіеве. Калі з'яўляюцца нейкія здымкі ў Мінску, то заўсёды стараюся на іх трапіць, таксама працягваю вучобу тут, ва ўніверсітэце. Я не згодна з тымі, хто мне кажа: «Ты з'ехала спяваць ва Украіну, таму тут цябе хутка забудуць». Большая верагоднасць, што ты станеш папулярным выканаўцам у Беларусі, калі твае песні будуць раціравацца на замежных радыёстанцыях, а кліпы можна будзе ўбачыць на замежных тэлеканалах, а не наадварот. На жаль, сёння так складваецца, што «зробленае ў Беларусі» мы не ўспрымаем, хоць у нас ёсць шмат годных выканаўцаў. Яны проста не знаходзяць сваю аўдыторыю і таму едуць рабіць кар'еру ў іншыя краіны. А як толькі артыст заваёўвае гледача недзе за мяжой, то абавязкова потым нехта згадае, што «ён жа наш, беларускі».

***— Што, акрамя музыкі, звязвае вас з украінскай сталіцай?***

— У Кіеве жыве мая старэйшая сястра Хрысціна. Яна, дарэчы, ужо даволі вядомая дызайнерка інтэр'ераў ва Украіне, а некалькі гадоў таму спявала разам з Ільёй Міцько ў іх сумесным праекце «Love&Doors» (у іх была тады вельмі папулярная песня ў Беларусі «Get down my baby»). Я пачала спяваць пад уплывам сястры. Раней, калі іграла на фартапіяна, нават не думала пра тое, каб стаць спявачкай. Але глядзела на яе і таксама захацела паспрабаваць. У нас з Хрысцінай вялікая розніца ва ўзросце, і, калі яна жыла ў Мінску, нам было складана кантактаваць, бо адсутнічалі агульныя інтарэсы. А цяпер мы жывём разам у Кіеве і пазбаўляемся ад прабелаў у нашых адносінах.

***— Спыненне супрацоўніцтва з Леанідам Шырыным вы лічыце правільным рашэннем?***

— Я ніколі не сумняваюся ў сваіх рашэннях. І ў гэтым выпадку таксама думаю, што ўсё да лепшага. Проста на нейкім этапе пасля «Акадэміі талентаў» я адчула, што не атрымліваю




задавальнення ад таго, чым займаюся. Не тыя песні спяваю, выступаю не ў тым вобразе. Усё ж такі прайшло два гады пасля праекта, змяніліся мае музычныя густы, і ў выніку нашы з Леанідам погляды на працу пачалі разыходзіцца. Цяпер я ўжо дакладней бачу сябе як выканаўцу, разумею, якіх мэт жадаю дасягнуць.

***— Ці чакаць прыхільнікам выхаду альбома, які вы планавалі выдаць у тандэме з прадзюсарам?***

— Пасля «Акадэміі талентаў» мы запісалі тры песні, якія, магчыма, увайшлі б у мой дэбютны альбом. Аднак з цягам часу я зразумела, што ў гэтых кампазіцыях не раскрываюся, не магу расказаць слухачу сваю гісторыю. Таму выхад пласцінкі адкладаецца. Я пішу новыя песні і спадзяюся, што ў бліжэйшы час парадую прыхільнікаў сольным альбомам, дзе буду не толькі выканаўцай, але і аўтаркай песень.

**«Калі артыст вырашае ўдзельнічаць у адборы, то павінен быць гатовы да жорсткай і не заўсёды абгрунтаванай крытыкі. Трэба мець вытрымку і моцныя нервы, каб абстрагавацца ад водгукаў, каментарыяў і проста рабіць сваю справу».**

***— Якія, на ваш погляд, інвестыцыі сёння патрэбны артысту, каб быць на слыху?***

— Цяпер такі час, калі ўсё можна знайсці і спампаваць у інтэрнэце. Адзінкі сёння пойдуць у краму, каб набыць ваш альбом. Большасць маладых артыстаў сталі вядомымі і папулярнымі за кошт раскруткі ў сацыяльных сетках. Я не прадзюсар і не скажу дакладна, што колькі каштуе, але мне здаецца, што выдаткі сённяшніх артыстаў меншыя за тыя, якія патрабаваліся спевакам раней. Але, напрыклад, стаць папулярным у тым жа інтэрнэце не так проста, як здаецца на першы погляд. Нават калі выканаўца запіша хіт і выкладзе яго на сваёй старонцы, то верагоднасць, што заўтра кампазіцыя будзе гучаць паўсюль — 1 працэнт з 10 000. Бо трэба мець граматнага PR-менеджара, зняць кліп і г.д. Зразумела, усё гэта патрабуе фінансавых выдаткаў, бо ніхто не захоча працаваць проста за ідэю. І ў вобразе самога артыста павінна быць штосьці ўнікальнае, бо копія нікога не зацікавіць. Цяжка знайсці сваю нішу, але магчыма. І калі гэта ўдаецца, то потым усё пачынае складвацца.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.956.
Нумар падпісаны ў 19.30 3.02.2016 г.

■ Ведай нашых!

# ...І ТЧЭ ЗАБЫЎШЫСЯ РУКА

**Соф'я Аляксееўна Юркевіч жыве ў вёсцы Вулька-Целяханская Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Пайшоў ёй 87-ы год. Але і ў такім шаноўным узросце жанчына шчыруе за ткацкім станком, трымае карову, садзіць агарод, на веласіпедзе ездзіць у ягады...**
**— Без работы я не магу, — прызнаецца бабуля.**


Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.

Калі пачалася Вялікая Айчынная, Соф'і Аляксееўне было толькі 12.

Жанчыне цяжка ўспамінаць ваенныя ды пасляваенныя гады, замужжа, будоўлю сваёй хаты. З мужам Мікалаем, які таксама родам з Вульркі-Целяханскай, яны выхавалі шасцёра дзяцей: Славу, Юру, Валодзю, Васіля, Таню і Мікалая. Яго, на вялікі жаль, не стала ў 35 гадоў, і для маці гэтая страта дагэтуль застаецца незагойнаю ранай, ад якой яна ратуецца работай.

— Свякроў наша — натура творчая. Без справы ні хвіліны не сядзіць, — расказвае нявестка Галіна, жонка сына Валодзі. — Калі я прыйшла ў гэтую сям'ю, свякроў шмат вязала — і кручком, і пруткамі. Вышывала многа. І ткала. З усіх захапленняў гэта самае любімае. Усім дзецям, унукам, праўнукам яна надарыла столькі сваіх работ, што паліцы ломяцца... Дапамагае нам усім, не забывае пра дні нараджэння — віншуе.

Унукаў у Соф'і Аляксееўны 9, праўнукаў — 11. Калі ў хату стукалася вяселле, то шчодры пасаг ручной работы атрымліваў кожны.

У хаце ў майстрыхі ёсць так званая руская печ, у якой гаспадыня пячэ бліны, пірагі ды іншыя прысмакі на хатнім малацэ. Яна і нас кінулася частаваць сваім свежым печывам, з ахвотай расказвала рэцэпты, але ж з асаблівай пяшчотай гаварыла пра ткацтва. Не танны, дарэчы, занятак: толькі на ніткі бабуля штомесяц аддае каля мільёна рублёў.

Ткаць Соф'ю Аляксееўну навучыла яе матуля Наталля Пятроўна. Праўда, станок, які дастаўся у спадчыну, з часам стаў падводзіць. Тады жанчына папрасіла зрабіць ёй новы, а мясцовы майстар прапанаваў ёй прывезці гатовы — ад сваёй бабулі. З тае пары кросны ў хаце і «прапісаліся».

— Сяду за іх — усе ліхія думкі знікаюць, усе хваробы праходзяць, — кажа майстрыха. — Час не ідзе, а ляціць... Хоць і галавой думаць трэба, каб не збіцца з узорам.

Жанчына расказвае і паказвае, як засноўваецца палатно, якую ролю выконвае ніт, пруткі, бёрда, як прасоўваецца чаўнок, каб атрымліваўся каляровы ўзор...

Прызнаюся, колькі ні сачыла за спрытнымі рукамі майстрыхі, не магла зразумець, як можна ўтрымліваць у галаве ўсе тонкасці гэтага складанага працэсу...

А ў суседнім пакоі, між іншым, швейная машынка.

Але і гэта яшчэ не ўсё.

— Я ж на веласіпедзе ў лес езджу: у грыбы, у журавіны, чарніцы. Нічога, бывае, не набяру, калі не грыбны ці не ягадны год, але ж хоць пагляджу...

Як расказваюць сыны і нявесткі, Соф'я Аляксееўна што надумала — тое і зробіць, за ёй не ўгонішся. Але ж пры гэтым яна імкнецца нікога не пакрыўдзіць, не ствараць іншым клопату, не назаляць. Сена для каровы нарыхтоўваюць сыны з дзецьмі, а даглядае кароўку яна сама.

Нявестак сваіх Соф'я Аляксееўна хваліць, унукаў ды праўнукаў — таксама. Адно яе засмучае — ніхто не праяўляе цікавасці да яе любімага ткацтва. Кажуць — не модны занятак.

А можа, не «дараслі» мы да яго.

**Валянціна БОБРЫК,** *г. Івацэвічы.*

■ Чытач — газета

# ЛУЧЫНСКАЯ ЗОРКА




**Наша чытачка Соф'я Кусянкова ў раённы вузел паштовай сувязі прыехала са сваёй вёскі Лучын, каб падтрымаць журналістаў пры правядзенні падпісной кампаніі. Сама жанчына ўжо шмат гадоў з'яўляецца не толькі пастаяннай падпісчыцай, але і аўтаркай нашай газеты.**

— Гэта спачатку я была звычайнай чытачкай. Потым — дзесьці з 2001 года — пазнаёмілася з многімі журналістамі і стала пісаць у газету. А далей, як той казаў, пайшло і паехала. Дзякуючы таму, што стала друкавацца ў «Звяздзе», пачала пісаць розныя творы ўвогуле, нават прыпеўкі. Збіраю інфармацыю пра нашы мясцовыя гаворкі, тапонімы і гідронімы... Дарэчы, зусім нядаўна гісторыі, якія раней друкаваліся ў «Звяздзе», былі аб'яднаны пад вокладкай вялікай кнігі. Яе мне дапамаглі стварыць і надрукаваць у межах адной з ініцыятыў праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца Праграмай развіцця ПРААН і фінансуецца ЕС.

Соф'я Парфір'еўна ўпэўнена, што яе родная вёска Лучын, дзе яна ўсё жыццё прапрацавала бухгалтаркай, магла б стаць новай сталіцай гумару ўсёй Беларусі.

— Больш за 10 гадоў я пішу ў рубрыку «Алё, народ на провадзе». Напісала каля 90 гісторый пра Лучын — вельмі смешных. Калі з'явілася рубрыка Валянціны Доўнар «Простая мова», яна была нечым нязвычайным. Гэта ж пра наша жыццё, і менавіта таму мне падабалася. Вельмі крыўдна, калі гавораць, што наша мова непрыгожая, грубая, хамская. Нельга так ставіцца да сябе, да сваёй спадчыны. Не любіць мову — значыць, не любіць не толькі сябе, але і сваіх продкаў, якія размаўлялі на гэтай мове. У «Звяздзе» ёсць усё, што патрэбна: інфармацыя і пра палітыку, і пра кухарства, і пра гароднiцтва. Таму я ўсім прапаную падпісвацца на родную газету на роднай мове і нават пісаць у яе свае гісторыі. Я ж увогуле ваша фанатка.

Між тым, аматаркай нашай газеты з'яўляецца і начальнік Рагачоўскага раённага вузла паштовай сувязі Святлана Зайцава. Яна выпісвае газету разам з маці і карыстаецца слушнымі парадамі. Напрыклад, вычытала, як зрабіць «смажаны боршч», і цяпер яго робіць толькі па «звяздоўскім» рэцэпце.

— Так гадамі склалася, што ў вас ёсць пастаянныя падпісчыкі. Газета «Звязда» для многіх — самы галоўны крытэрый праўды. Гавораць: калі ў «Звяздзе» напісана — можна верыць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Настрой

# «ЛЯЛЬКІ»

Гэткую прыгожую назву носіць фальклорны гурт, створаны ў СШ № 40 г. Гомеля. За восем гадоў ён паспеў выступіць на самых розных сцэнічных пляцоўках і, дзякуючы свайму артыстызму ды беларускім народным песням, заваяваць папулярнасць сярод гледачоў.

А кіруе гэтым дзіцячым калектывам Марына Мытнікава, настаўніца музыкі і нястомны прапагандыст роднай мовы і культуры, спрадвечных беларускіх абрадаў і звычаяў.

**Ганна СЯМЁНАВА,** *г. Гомель*



■ Што бачу...

# БЕЛАЕ І ЧОРНАЕ

...Добра, калі пад сонцам блішчыць снег. Глядзіш на яго і думаеш, што гэта космас з усімі сваімі зоркамі! Глядзіш і здзіўляешся — як здзіўлялася, калі быў малым, калі шмат у што верыў і з упэўненасцю казаў: «Ён ніколі не знікне...»

Бруд усё сапсаваў. Ён змяшаў з сабой мару пра чысціню, ён запоўніў сабой прастору і паказаў рэчаіснасць. Чорныя дрэвы пад ветрам хісталіся, як змрочныя прывіды. «Заўтра я не выйду да вас...» — падумалася на ганку.

Тым часам аб ногі пацёрся цёплы, пухнаты кот, ціха мурлыкнуў і, як пан, павёў у хату, дзе можна забыцца пра гэты бруд і зноўку чакаць бялюткага снегу.

**Алег НІКУЛІН**

■ Чалавек — чалавеку

# КАМУ ЎСМІХАЕЦЦА ДЖАКОНДА

**Відаць, кожны хоць раз у жыцці ды зведаў рамантыку падарожжаў, радасць новых адкрыццяў.**
**Праўда, у кожнага падарожніка мэта свая: нехта імкнецца папесціцца ў хвалях паўднёвага мора ды паляжаць пад гарачым сонцам, нехта — патраціць грошы ў рэстаранах ды крамах, асобныя — выбіраюць маршруты, дзе можна на другіх паглядзець і сябе паказаць. Але ж большасць турыстаў хоча аднаго — спазнаць свет, на свае вочы пабачыць цуды прыроды, архітэктуры, гісторыі, мастацтва...**

Такім чынам мы з жонкай — па настойлівых парадах дачкі і зяця — адважыліся на дзесяцідзённы аўтобусны круіз «па Еўропе».

Адразу зазначу: падарожжа атрымалася вельмі цікавае, з мноствам незабыўных яркіх уражанняў. Бо хіба ж можа не ўразіць, напрыклад, знакаміты Аляксандэрплац у цэнтры Берліна ці Рэйхстаг?..

І зараз перад вачыма Амстэрдам — горад, народжаны на вадзе, з яго мастамі і каналамі, з яго своеасаблівай архітэктурнай спадчынай і веласіпедамі. Іх, дарэчы, там безліч. Здаецца, яны прывезены сюды з усяго свету! Плошча Дам, велічны каралеўскі палац, дом-музей Рэмбранта, хоць і подбегам (бо як жа прамінуць!) — вядомы квартал чырвоных ліхтароў.

А за некалькі кіламетраў ад сталіцы Нідэрландаў — сапраўдная казка: кветкавы парк... Столькі цюльпанаў (а мы трапілі якраз падчас цвіцення) не ўбачыш, мусіць, нідзе і ніколі.

Потым была прагулка па венецыянскіх каналах — на сапраўднай гандоле з сапраўдным гандальерам! Пад уражаннем я нават заспяваў!

...«Гэй, земляк!» — гэта першае, што пачуў на першай жа маставой у цэнтры Парыжа (а цэнтр там, дарэчы, паўсюль, дзе ступіла нага). Азіраюся, бо не верыцца, што побач хтосьці знаёмы... «Купі, земляк», — чорны як смоль афрыканец настойліва прапануе мне сувеніры... Ветліва адмахнуўся ды толькі падзівіўся таму, наколькі ж спрактыкаваныя ў іх вочы, бо сярод процьмы іншых турыстаў яны беспамылкова вызначаюць ці не ўсіх рускамоўных.

А турысты, вядома ж, розныя — па ўзростах, прафесіях, жыццёвым досведзе, сваім эстэтычным узроўні... Адну з нашых спадарожніц, напрыклад, у турнэ праводзілі сяброўкі па працы на птушкафабрыцы. «Прыеду дамоў, — усю дарогу разважала жанчына, — зноў збяру за сталом! Будзе што расказаць».

Каб не забыцца, дзе і што яна бачыла (прычым канкрэтна), жанчыне давялося, што называецца, уздоўж і ўпоперак спісаць ладны сшытак.

— Яшчэ б Мадонну пабачыць, — марыла Галіна Іванаўна.

І вось мы ў Луўры — велізарным музейным комплексе. Даўжыня фасадаў яго складае каля пятнаццаці кіламетраў! Паспрабуй тут абыдзі яго, паспрабуй знайдзі сярод безлічы экспанатаў тую таямнічую Джаконду. Аднак мы, натхнёныя аптымізмам Галіны Іванаўны, адразу ж пайшлі па стрэлках, якія ўказвалі напрамак да мэты...

Было — у адным месцы «праскочылі» міма, потым прыйшлося вярнуцца, але ж карціну ўбачылі.

— Ну як? — спыталі потым у Галіны Іванаўны.

— Яна мне ўсміхнулася! — з гонарам адказала жанчына.

Ну, думаю, мэта дасягнутая і зараз можна будзе спакойна пахадзіць па Луўры, паглядзець хоць некалькі залаў... Ды не тут тое было!

— Пойдзем шукаць бязрукую жанчыну, — скамандавала наша спадарожніца, і нам нічога не заставалася, як падацца за ёю следам у пошуку Венеры Мілоскай.

Пакуль адшукалі патрэбную залу, пакуль палюбаваліся на вядомую на ўвесь свет скульптуру невядомага аўтара, — настаў час выходзіць, шукаць сваю групу. Такім чынам, да вялікага мастацтва, прадстаўленага ў Луўры, удалося дакрануцца толькі праз «дзвюх жанчын» — Джаконду і Венеру Мілоскую. Значыць, будзе нагода, каб прыехаць у Парыж — ужо знаёмы і незнаёмы — яшчэ раз. І тады ўжо спакойна пастаяць каля многіх жывапісных і скульптурных скарбаў.

Дарэчы, нядаўна я даведаўся, што наша спадарожніца Галіна Іванаўна па-ранейшаму захаплянна распавядае ўсім пра сваё падарожжа. І, што адметна, Венеру Мілоскую яна не называе больш бязрукай жанчынай. Відаць, уразіла... Прычым настолькі, што многія з яе слухачак сталі марыць пра Парыж... Асобныя ж адразу папрасілі дарослых дзяцей заказаць ім тур «па Еўропе».

**Мікалай ЮРУЦЬ,** *г. Ляхавічы.*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5** |
| Продавец | **Филиал «Автотранспортное предприятие №1 г. Витебска» ОАО «Витебскоблавтотранс», г. Витебск, ул. Гагарина, 68** |
| Месторасположение предмета аукциона | **Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 24** |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)**

| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Здание конторы** | 200/С-53370 | 278,6 | ул. Гагарина, 24/ 1 |
| Составные части и принадлежности | асфальтобетон. покрытие и покрытие для стоянки машин, метал. ограждение для металлолома, метал. ворота, забор наружный, метал. ворота – 6 шт. | | |
| **Прачечная** | 200/С-53365 | 52 | ул. Гагарина, 24/6 |
| **Кузница** | 200/С-53393 | 101,9 | ул. Гагарина, 24/10 |
| **Здание ремонтной зоны** | 200/С-53375 | 127,5 | ул. Гагарина, 24/14 |
| **Бытовые помещения** | 200/С-53388 | 213 | ул. Гагарина, 24/15 |
| **Производственное здание** | 200/С-53374 | 248,6 | ул. Гагарина, 24/18 |
| **Компрессорная** | 200/С-53369 | 256,7 | ул. Гагарина, 24/19 |
| **Мойка, насосная** | 200/С-53364 | 242,6 | ул. Гагарина, 24/2 |
| Составные части и принадлежности | пристройка, туалет | | |
| **Здание технического обслуживания** | 200/С-53391 | 566,4 | ул. Гагарина, 24/3 |
| **Малярный цех** | 200/С-53368 | 116,8 | ул. Гагарина, 24/4 |
| **Автозаправочная станция** | 200/С-53390 | 9,4 | ул. Гагарина, 24/5 |
| Составные части и принадлежности | навес, сарай | | |
| **Моторный цех** | 200С-53372 | 49,4 | ул. Гагарина, 24/7 |
| **Шиномонтажная** | 200/С-53395 | 58,1 | ул. Гагарина, 24/8 |
| **Производственный корпус** | 200/С-53371 | 124,7 | ул. Гагарина, 24/13 |
| **Автомастерская** | 200/С-53363 | 382,9 | ул. Гагарина, 24/16 |
| **Мастерская** | 200/С-53366 | 249,8 | ул. Гагарина, 24/17 |
| **Склад** | 200/С-53392 | 50,2 | ул. Гагарина, 24/9 |
| Составные части и принадлежности | сарай, навес, уборная | | |
| **Склад** | 200/С-53389 | 228,8 | ул. Гагарина, 24/11 |
| **Склад** | 200/С-53373 | 59,7 | ул. Гагарина, 24/12 |
| **Очистные сооружения** | 200/С-60851 | 48,9 | ул. Гагарина, 24 |
| **Электрокабели** | 200/С-60838 | 50,00 м | |
| **Тепловая сеть** | 200/С-92654 | 20,6 м | |
| Составные части и принадлежности | выпуск дренажа | | |
| **Канализация ливневая** | 200/С-60843 | 158,45 м | |
| **Канализация хозфекальная** | 200/С-60845 | 571,60 м | |
| **Водопровод технический** | 200/С-60840 | 74,40 м | |
| **Водопровод хозпитьевой** | 200/С-60834 | 243,35 м | |
| Составные части и принадлежности | трубопровод чугунный, стальной и ПСП | | |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу для содержания и обслуживания производственных и складских зданий на праве долевого постоянного пользования пл. **1,4883 га** (доля: 23/25). Ограничения: расположен в охранных зонах линий связи и радиофикации, пл. 0,0067 га | | | |
| **Административное помещение** | 200/Д-108107 | 1219,8 | ул. Гагарина, 24, пом. 2 |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен продавцу для содержания и обслуживания административно-бытового корпуса на праве долевого постоянного пользования земельный участок пл. **0,1222 га** (доля: 1/2). Ограничения: расположен в охранных зонах линий связи и радиофикации пл. 0,0024 га, линий электропередачи напряжением до 1000 В пл. 0,0024 га и свыше 1000 В пл. 0,0024 га, сетей и сооружений водоснабжения пл. 0,0112 га и канализации пл. 0,0252 га | | | |

**Начальная цена с НДС 20% – 6 203 311 200 белорусских рублей (снижена на 50%)**

**Предмет аукциона обременен договорами аренды**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **11.03.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **09.03.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62**

**Продавец:** ОАО «КУПЦОВЪ», Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1, (029) 509-02-27.

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №220/D-5037, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1, пом. 1, общей площадью 3 769,4 кв.м, наименование – производственный корпус № 1; Изолированное помещение с инв. №220/D-5039, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1, пом. 3, общей площадью 263,1 кв. м., наименование – фабрикатный цех. Нач. цена: 849 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 84 900 000 бел. руб. Шаг аукциона – 42 450 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №220/С-26666, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, 122, общей площадью 531,4 кв.м, наименование – склад-арочник. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым №221550100001004903 площадью 0,3866 га. Нач. цена: 84 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 8 400 000 бел. руб. Шаг аукциона – 4 200 000 бел. руб.

Лот №3. Капитальное строение с инв. №220/С-11460, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 58,3 кв.м, наименование – проходная-весовая. Капитальное строение с инв. №220/С-11455, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, 127, общей площадью 1242,9 кв.м, наименование – капустохранилище. Нач. цена: 801 658 560 бел. руб. без НДС. Задаток: 80 165 900 бел. руб. Шаг аукциона – 40 083 000 бел. руб.

Лот №4. Капитальное строение с инв. №220/С-11452, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 124, общей площадью 1799,2 кв.м, наименование – овощехранилище (картофелехранилище). Нач. цена: 1 315 765 680 бел. руб. без НДС. Задаток: 131 576 600 бел. руб. Шаг аукциона – 65 789 000 бел. руб.

Лот №5. Капитальное строение с инв. №220/С-11453, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 131, общей площадью 2 322,6 кв.м, наименование – овощехранилище. Нач. цена: 577 281 300 бел. руб. без НДС. Задаток: 57 728 200 бел. руб. Шаг аукциона – 28 865 000 бел. руб.

Лот №6. Капитальное строение с инв. № 220/С-11459, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 14,4 кв.м, наименование – подстанция подсобного хозяйства. Нач. цена: 17 427 360 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 742 800 бел. руб. Шаг аукциона – 872 000 бел. руб.

Лот №7. Грузовой фургон МАЗ 43704 3, цвет белый, рег. знак АВ 5951-2, 2008 г.в. Нач. цена: 53 720 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 5 372 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 686 000 бел. руб.

Лот №8. Трактор МТЗ 80, рег. знак БЯ 0815, 1992 г.в. Нач. цена: 28 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 800 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 400 000 бел. руб.

Лот №9. Грузовой фургон GAZ-3309, цвет белый, рег. знак АЕ 2323-2, 2010 г.в. Нач. цена: 38 480 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 848 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 924 000 бел. руб.

Лот №10. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет голубой, рег. знак АА 4577-2, 1988 г.в. Нач. цена: 9 760 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 976 000 бел. руб. Шаг аукциона – 488 000 бел. руб.

Лот №11. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет синий, рег. знак АВ 1360-2, 1991 г.в. Нач. цена: 16 840 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 684 000 бел. руб. Шаг аукциона – 842 000 бел. руб.

Лот №12. Грузовой фургон GAZ-33021, цвет светло-серый, рег. знак АВ 6061-2, 1997 г.в. Нач. цена: 9 760 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 976 000 бел. руб. Шаг аукциона – 488 000 бел. руб.

Лот №13. Грузовой бортовой UAZ-3303, цвет зеленый, рег. знак 1091ВТР, 1991 г.в. Нач. цена: 10 280 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 028 000 бел. руб. Шаг аукциона – 514 000 бел. руб.

Лот №14. Автобус вагон PAZ 3205, цвет белый, рег. знак АВ 1518-2, 1993 г.в. Нач. цена: 22 720 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 272 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 136 000 бел. руб.

Лот №15. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №42. Нач. цена: 25 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 500 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 250 000 бел. руб.

Лот №16. Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-7,2, инв. №48. Нач. цена: 18 920 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 892 000 бел. руб. Шаг аукциона – 946 000 бел. руб.

Лот №17. Сеялка зерновая Directa 400 Corsa, инв. №592. Нач. цена: 108 280 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 10 828 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5 414 000 бел. руб.

Лот №18. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №1711. Нач. цена: 25 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 500 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 250 000 бел. руб.

Лот №19. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №6108. Нач. цена: 25 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 500 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 250 000 бел. руб.

Лот №20. Сеялка механическая навесная СМН-12, инв. №7003. Нач. цена: 22 920 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 292 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 146 000 бел. руб.

Лот №21. Культиватор опрыскиватель универсальный КОУ-4/6, инв. №7700. Нач. цена: 11 560 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 156 000 бел. руб. Шаг аукциона – 578 000 бел. руб.

Лот №22. Агрегат комбинированный посевной АКП-4, инв. №9042. Нач. цена: 24 200 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 420 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 210 000 бел. руб.

Лот №23. Опрыскиватель прицепной штанговый Мекосан 2500-18, инв. №9045. Нач. цена: 32 440 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 244 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 622 000 бел. руб.

Лот №24. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №414. Нач. цена: 18 840 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 884 000 бел. руб. Шаг аукциона – 942 000 бел. руб.

Лот №25. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №415. Нач. цена: 14 600 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 460 000 бел. руб. Шаг аукциона – 730 000 бел. руб.

Лот №26. Косилка роторная Z-173/1, инв. №1023. Нач. цена: 4 830 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 483 000 бел. руб. Шаг аукциона – 242 000 бел. руб.

Лот №27. Машина термоусадочная Profipack PR700, инв. №2012. Нач. цена: 18 660 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 866 000 бел. руб. Шаг аукциона – 933 000 бел. руб.

Лот №28. Рефрижераторный контейнер, инв. №474. Нач. цена: 19 950 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 995 000 бел. руб. Шаг аукциона – 998 000 бел. руб.

Лот №29. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, 1989 г.в., цвет голубой, регистрационный знак ВА 8751. Нач. цена: 8 250 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 825 000 бел. руб. Шаг аукциона – 413 000 бел. руб.

Лот №30. Грузовой бортовой GAZ–53А, 1981 г.в., цвет голубой, регистрационный знак АА 4591-2. Нач. цена: 6 240 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 624 000 бел. руб. Шаг аукциона – 312 000 бел. руб.

Лот №31. Грузовой фургон GAZ 3309 «Белава-02», 2011 г.в., цвет белый, регистрационный знак АЕ 5492-2. Нач. цена: 32 220 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 222 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 611 000 бел. руб.

Лот №32. Насос Ж-6 ВНП 1032, инв. №447. Нач. цена: 10 700 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 070 000 бел. руб. Шаг аукциона – 535 000 бел. руб.

